Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 329 (4235)
Чацьвер, 10 сьнежня 1931 г.
МЕНСК, Савецкая 83

Сеньня ў нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВАЯ—Вышэй авангардную ролю нізавых партзьвеньняў на транспарце (1 стар.). Ю. ЛЕНСКІ—Ад «пацыфікацыі» да ваенна-палявых судоў (2 стар.). І. С. Адам—Бліжэйшыя задачы калдагаворнай кампаніі (3 стар.). Ул. ЛІЛІН—Сыгналы з мясцовага фронту (3 стар.).

АГЛЯД ДРУКУ—Аб «апартуністычным бальме» і «сьляпым розуме» акцыі газэты (2 стар.).

АБ СКЛІКАНЬНІ ЗЬЛЁТУ ЎДАРНІКАЎ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ—Пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

Калгасы павінны выканаць плян збожжазагатовак не пазьней 15-20 сьнежня (1 стар.).

Мацней агонь па апартуністах, якія перашкаджаюць разгортваньню савецкага гандлю (2 стар.).

Работа пунктаў абмену не наладжана (3 стар.).

Выйдзем у першыя калёны змагароў за фінплян (3 стар.).

На партнарадзе па мастацтве (4 стар.).

ГЕРМАНІЯ. Выдан новы надзвычайны дэкрэт (4 стар.).

КІТАЙ. Акупанты ператвараюць Манчжурыю ў сваю калёнію (4 ст.).

Вышэй авангардную ролю нізавых партзьвеньняў на транспарце

Партыя вызначыла разгорнутую праграму сацыялістычнай рэканструкцыі чыгуначнага транспарту, узьдыму яго работы на ўзровень тэмпаў развіцьця ўсёй народнай гаспадаркі краіны.

Пасьпяховае ажыцьцяўленьне гэтай праграмы цесна зьвязана з паляпшэньнем работы партыйных арганізацый, з павышэньнем авангардной ролі камуністаў на вытворчасьці. Між тым «работа партыйных і камсамольскіх арганізацый поўнасьцю яшчэ не перабудавана і ў радзе выпадкаў адстае ад тэмпаў, якія прад'яўляюцца транспарту. У радзе выпадкаў камуністы і асобныя партарганізацыі не ажыцьцяўляюць кіруючую авангардную ролю на вытворчасьці, не зьяўляюцца пераканаўчымі ў барацьбе за лепшыя паказьнікі, ня ўся маса камуністаў і камсамольцаў учапчута ў сацыяборніцтва і ўдарныя брыгады».

Гэта ацэнка, дадная кастрычніцкім пленумам ЦК КП(б)Б на аснове глыбокага аналізу становішча, з ўсёй сілай ставіць пытаньне аб **перабудове партыйнай работы на транспарце.** Формы і напрамак гэтай перабудовы вызначаюцца тымі палітычнымі задачамі, якія пастаўлены партыяй на даным этапе. Зараз ніжэйшым партыйным зьвяном зьяўляецца не ячэйка прадпрыемства, вучастку або службы, а партыйная група на ўдарнай брыгадзе. Партгрупа яшчэ зноўны цяжар жыцьця зь прадпрыемствам. Таму зараз галоўнае ў перабудове партработы — умацаваць нізавыя партыйныя зьвенні, наблізіць штодзённае канкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва імі, забясьпечыць партыйным уплывам можную брыгаду, групу, паравоз.

Перабудова партыйнай работы—сродак, прычым адзін з важнейшых, у барацьбе за поўнае ажыцьцяўленьне вытворчых праграм пяцігодкі. КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК дабілася значных посьпехаў у перабудове партыйнай работы. На аснове ажыцьцяўленьня сажавіцкай пастановы ЦК УсесКП(б) многія партарганізацыі стварылі моцныя нізавыя партзьвенні, перанесьлі цэнтр цяжару партыйна-масавай работы ў цэх, групу, брыгаду. У транспартных партарганізацыях праведзена работа на разбуйненьні партыйных калектываў, створан рад ячэек на вытворчым прыцыпе.

Аднак, гэта нікольі ня значыць, што ў партыйных арганізацыях чыгуначных вузлоў усё зроблена ў напрамку перабудовы партыйнай работы. На **Менскім чыгуначным** вузле ў партколектыве цяпер не арганізавана ні адная партыйная група. Тое-ж самае і на заводзе «Полымя рэвалюцыі». Рад парткалектываў **Віцебскага вузла** фармальна патыйлі да перабудовы партработы.

Самае галоўнае і самае важнае ў партыйна-масавай рабоце на транспарце зараз заключаецца ў тым, каб мабілізаваць усю масу партыйцаў і рабочых-чыгуначнікаў на ажыцьцяўленьне шасьці ўмоў тав. Сталіна. Для гэтага трэба пачыняючы падыйсьці да вытворчых пытаньняў, паставіць іх на канкрэтнае вырашэньне, павесьці жорсткае змаганьне супроць «лявацкай» ураўнілаўкі і абязьлічкі як на паравозе, так у дэпо і на лініі.

Нельга з посьпехам ажыцьцёніць шэсьць сталінскіх умоў, нельга ўзьняць на вышэйшую ступень работу транспарту бяз жорсткага змаганьня супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць прымірэнцаў. Суадносіны клясавых сіл у нашай краіне каронным чынам зьмяніліся на карысьць пралетарыяту. Аднак, яшчэ ня зжыты мачымасьці прасочваньня клясава-варожых уплываў на найбольш адсталыя групы рабочых, на асобных нэўстойлівых членаў партыі. Гэтыя клясава-варожыя ўплывы і зьяўляюцца тэй глебай, на якой вырастаюць ухілы і хістаньні ад генэральнай лініі партыі.

Нежаданьне змагацца за высокія тэмпы сацыялістычнай рэканструкцыі, нежаданьне ажыцьцяўляць шэсьць сталінскіх умоў, прытуленьне клясавай чужасьці, стаўка на самацёк, настрой супакоенасьці і «благодушия», панкоўства і алілюйшчына—характэрныя рысы праўдоніны апартунізму. Транспартныя партарганізацыі, выдучы жорсткае змаганьне з усякімі праяўленьнямі апартунізму і прымірэнцтва да ўхілаў ад генэральнай лініі партыі, павінны ўжыць усе меры для таго, каб ліквідаваць адставаньне транспарту ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Паравозны і вагонны парк адыгрываюць рашаючае значэньне ў выкананьні плянаў асеньня-зімовых перавозак, зьяўляюцца асновай усёй работы транспарту. Дабіцца поўнай ліквідацыі абязьлічкі, высокаякаснага і хуткага рамонту, павялічыць вытворча-карысную работу паравоза і вагона—вось канкрэтная задача, якая стаіць перад кожным нізавым партыйным зьвяном транспарту. Рад партыйных ячэек, праводзячы справаздачна-перавыбарчую кампанію парторганаў, дабіліся вялікіх посьпехаў. Ячэйка вагонна-рамонтнага цэху (Жлобін) перавыконае плян рамонту вагонаў на 50 проц. Ячэйка паравозьнікаў дабілася зьніжэньня хворых паравозаў на 4 проц., узьняла процант спаранай язды да 99,5 проц.

Работа экспліятацыі і плянаваньня перавозак—адзін з слабых вучасткаў на транспарце. **Задача партыйных арганізацый заключаецца ў тым, каб дабіцца выразнасьці ў рабоце экспліятацыі, забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне загаду тав. Андрэева аб марпрутызацыі, удасканаліць работу дыспэтчэрскага апарату.** Гэты вучастак работы патрабуе ўзмацніць партыйнымі сіламі.

Укараненьне гаспадарчага разрахунку ва ўсе звенні на транспарце, скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў патрабуе ад нізавых партыйных зьвеньняў узмоцненай мабілізацыі мас на барацьбу супроць фармальных адносін да гэтых важнейшых вагароў у паляпшэньні работы чыгункі. Зламаць супраціўленьне апартуністаў, якое аказваецца ўвядзеньню гаспадарчага разрахунку, зрабіць нізавое вытворчае зьвяно гаспадарчай адзінкай, дабіцца эканоміі матар'ялаў — адказьнейшыя задачы партыйных ячэек і партгруп.

Ажыцьцяўленьне нацыянальнай палітыкі партыі павінна пранізаць усю партыйна-масавую работу транспартных партарганізацый. Год таму назад кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б канстатаваў, што ў галіне ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі чыгунка зьяўляецца самым слабым месцам. Некаторыя з чыгуначных парт'ячэек ня ўжылі мер, каб узьняць беларусізацыю на вышэйшую ступень, каб мабілізаваць масы на непрымірымае змаганьне супроць ухілу ў бок зьяднаньня ўжываўлага шавінізму, беларускага нацыяналізму і шавінізмаў іншых колераў. У партыйнай ячэйцы ст. Мазыр да гэтага часу ўсю работу праводзяць на расійскай мове. Месячнік генэральнай праверкі беларусізацыі праведзен фармальна. Сярод адсталых рабочых былі факты праўдзеў няў антысэмітызму. Партыйная ячэйка на гэтыя факты не рэагавала, не давала ім палітычнай ацэнкі.

Гэта ўсё абавязвае рэзка паставіць пытаньне аб узмацненьні работы па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі і не сустаўной часткі—беларусізацыі.

Сацыялістычнае будаўніцтва вымагае, каб самыя шырокія партыйныя масы аўладалі марксыцка-ленінскай тэорыяй. Між тым, на радзе буйнейшых чыгуначных вузлоў (Менск, Віцебск) партасьвета разгорнута невыстарчальна. Трэба ўжыць усе меры для таго, каб узьняць ідэйна-палітычнае выхаваньне партыйных мас і ў першую чаргу тых партыйцаў, якія пялаўна ўступілі ў рады КП(б)Б.

За апошнія гады на транспарт улілася сотні і тысячы новых рабочых. Задача заключаецца ў тым, каб выхаваць іх у пралетарскім духу, зрабіць сапраўды актыўнымі і самадзеяльнымі змагарамі за новыя перамогі па адказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

Ад кожнага камуніста патрабуецца аўладаньне тэхнікай, павышэньне сваёй авангардной ролі на вытворчасьці. Толькі той партыец можа весьці за сабою беспартыйныя масы, які зьяўляецца прыкладным у рабоце, які глыбока ведае сваю справу, які прымае ўдзел у сацыялістычным спаборніцтве і зьяўляецца перадавым ударнікам. Кожны партыец-чыгуначнік павінен памятаць, што ён знаходзіцца на адказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва, што ён сваёй штодзённай работай дапамагае партыі ажыцьцяўляць ідэі вялікага правадыра бальшавізму Ўладзімера Ільліча Леніна.

Аб скліканьні зьлётаў ударнікаў фабрык і заводаў

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Для падагуленьня вынікаў работы прамысловасьці ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі і намячэньня задач на 4 год пяцігодкі правесьці зьлёты ўдарнікаў на прадпрыемствах БССР.

Асноўнымі задачамі зьлётаў павінны быць мабілізацыя рабочых на падрыхтоўку да апошняга году пяцігодкі, на аснове поўнай рэалізацыі шасьці умоў, высунутых у прамове т. Сталіна, мабілізацыя максымальнай энэргіі рабочых мас прадпрыемстваў і чыгункі на ажыцьцяўленьне рашэньняў кастрычніцкага пленуму ЦК УсесКП(б) і ліквідацыя адсталасьці рабочых, шляхам стварэньня гаспадарча-разьліковых брыгад, арганізацыя масавага грамадзкага адпору рвацкім настроям часткі адсталых рабочых, шырокая папулярызацыя задач рабочай клясы ў перыядзе завяршэньня набудовы фундаманту сацыялізму. Цэнтральным пытаньнем зьлётаў паставіць барацьбу за якасьць прадукцыі.

2. З 1 сьнежня па 1 студзеня правесьці зьлёты ударнікаў па ўсіх прадпрыемствах і чыгунцы БССР, пад знакам падрыхтоўкі да ўсесаюзнага дня ўдарніцтва (1 студзеня).

3. Даручыць ЦСПСБ, ВСНГ і гаркомам КП(б)Б у сьнежні правесьці гарадзкія зьлёты ударнікаў прадпрыемстваў Менску, Віцебску, Гомелю, Магілеву, Бабруйску, Барысаву і Воршы.

4. Даручыць ЦП саюзу машына-будаўнічых рабочых, шэйнікаў, МТС, гарбароў, дрэваапрацоўшчыкаў, разам з адпаведнымі гаспадарчымі аб'яднаньнямі, правесьці зьлёты ударнікаў па асобных галінах прамысловасьці. Усебеларускі зьлёт ударнікаў-шэйнікаў правесьці ў Віцебску, гарбароў — у Магілеве, рабочых МТС — у Бабруйску.

5. Прызнаць неабходным прэміяваць у часе зьлётаў лепшых ударнікаў.

6. Для правядзеньня зьлётаў даручыць Агітпрапаму Аддзелу пасьлаць на прадпрыемствы кіруючых работнікаў.

7. Даручыць Культпропу ЦК распрацаваць мерапрыемствы па асьвятленьні работы прамысловасьці і паказе лепшых ударнікаў у газэтах, радыё і кіно.

Не дапусьціць зрыву пляну пераапрацоўкі гародніны

Ураджай гародных культур у БССР сёлета быў добры. Тым ня менш рабочыя раду раёнаў забясьпечваюцца гароднінай нездавальняюча.

Тэмпы загатовак за апошнія дні рэзка аслаблі. Плян завозу гародніны ў гарады БССР ня выконваецца—капусты завезена 55 проц., буракоў—57 проц., цыбулі—26 проц., морквы—87 проц.

Асабліва адстае ад пляну пераапрацоўка. Паводле пляну цэнтралізаванага снабжэньня ў Беларусі павінна быць заквашана 14.000 тон капусты і засолена 3.600 тон гуркоў. Апрача таго, каапэрацыйныя загатоўчыя арганізацыі павінны былі разгарнуць пераапрацоўку гародніны для мясцовага снабжэньня.

Асноўныя арганізацыі, на якія ўскладзена работа па пераапрацоўцы—Белкаапшлодагародніна і Белсадсаюз. Заданьне па квашэньні капусты выканала толькі ішвалідная каапэрацыя. Аб становішчы ў другіх арганізацыях Наркамснаб ня ведае. Але той факт, што месцы ўпарта не адказваюць на запытаньні, сьведчыць аб бязьдзейнасьці ў выкананьні заданьня па квашэньні капусты.

Белсадсаюз шват ня скончыў будаўніцтва квасільных пунктаў у Магілеве і Фанпалі. З другога боку, ёсьць паведамленьні аб тым, што пасобныя пункты Белсадсаюзу ў Мазыры і Віцебску не загружаны сырцом і не працуюць. Тлумачыцца гэта тым, што капуста разбазарваецца гандлёвымі арганізацыямі. Замест перадачы на квашэньне, віцебская кантора Белплодагародніны гноіць капусту на складах і крамах.

Плян засолкі гуркоў для цэнтралізаванага снабжэньня фактычна сарваны. Засолена толькі 20 проц. Белкаапплодагародніна павінна была засаліць на цэнтралізаваным пляне 3.000 тон гуркоў. Нядаўна Белкаапплодагародніна паведаміла Наркамснабу, што засолена 3.217 тон і плян такім чынам перавыкапан. Фактычна-ж гэта аказалася «очковтирательством» Замест 3.000 тон засолена толькі 217, а рэшта гуркоў загатоўлена нецэнтралізаваным парадкам і засолена ЗРК, ЦРК і іншымі каапэрацыйнымі арганізацыямі. Да 7 сьнежня Ленінграду і Маскве павінна быць адгружана 1.500 тон салёных гуркоў, між тым у гэтай галіне амаль нічога ня зроблена. У Наркамснабе цьвердзяць, што Белкаапплодагародніна павінна загатовіць для цэнтралізаванага снабжэньня 3.000 тон, а апошняя адносіць гэта да мясцовага снабжэньня. Абедзьве ўстановы знаходзяцца амаль на адной вуліцы і па такім важным пытаньні да гэтага часу не змаглі дагаварыцца.

Некаторыя раённыя арганізацыі праяўляюць месьніцкія, рвацкія настроі. Напрыклад, рагачоўскія рэгулюючыя органы забараняюць сельскім спажыўтаварыствам адгружаць салёныя гуркі і патрабуюць поўнасьцю пакінуць іх на месцы.

На Наркамснаб падае значная доля віны за зрыў пераапрацоўкі. Пляны былі спушчаны загатоўчым арганізацыям з вялікім спазьненьнем,—замест ліпеня—у верасьні. Няма канкрэтнага апэрацыйнага кіраўніцтва пераапрацоўкай і хаваньнем гародніны на зімовы пэрыяд. Наркамснаб ня мае прадстаўленьня аб тым, як загатоўчыя каапэрацыйныя арганізацыі выконваюць заданьні па загатоўцы, адгрузцы і пераапрацоўцы гародніны.

Наркамснаб, Белкаапплодагародніна, Белсадсаюз абавязаны неадкладна прыняць рашучыя меры да ўзмацненьня тэмпаў загатовак, загрузкі пераапрацоўчых пунктах, каб за лік павышэньня плянаў квашэньня капусты і сушкі гародніны перакрыць недавыкананьне плянаў па засолцы гуркоў.

М. К

„НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ"

КАЛГАСЫ ПАВІННЫ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН

НЕ ПАЗЬКЕЙ 15-20 СЬНЕЖНЯ

Засталіся лічаныя дні

Збожжазагатоўчая кампанія па калгасным сэктары ўступіла ў самы адказны пэрыяд.

ЦК КП(б)Б вызначыў канчатковы тэрмін сканчэньня здачы збожжа калгасамі—**не пазьней 15-20 сьнежня.** Каб у лічаныя дні, якія засталіся, поўнасьцю выканаць плян загатовак, калгасы павінны бязупынна фарсаваць тэмпы з пяціднёўкі ў пяціднёўку.

Апошнія даныя гавораць, што крывая здачы збожжа ўзьнімаецца вельмі павольна, што тэмпы загатовак па калгасах не забясьпечваюць поўнага ажыцьцяўленьня заданьняў да тэрміну. Першая пяціднёўка сьнежня дала толькі 5 проц.,—на 5 сьнежня калгасы выканалі толькі 72,2 проц. гадавога пляну.

Балвая, неадкладная задача дня—**наладзіць масавую работу ў калгасах, усямерка ўзмацняць барацьбу з кулацтвам, якое імкнецца сарваць здачу збожжа.**

Партарганізацыі павінны ажыцьцяўляць выразнае сыстэматычнае, апэрацыйнае кіраўніцтва ходам загатовак па калгасах, наносячы руйнуючыя ўдары па кулацка-спажывецкіх, рвацкіх тэндэнцыях, па праваднікох кулацкага ўплыву ў калгасах. Трэба ўстанавіць сутачныя заданьні калгасам па вывазе збожжа.

Факты паказваюць, што, дзе правільна **арганізаваны загатоўкі,** дзе наладжан кантроль паміж абмалотам і здачай, дзе праведзена шырокая палітычная работа і рашучая барацьба з дробна-ўласьніцкімі настроямі — там калгасы ўжо выканалі плян здачы збожжа (калгасы імя Чарвякова, 1-га мая і «Чырвоны араты», Мсьціслаўска га раёну, калгасы Доўскага сельсавету, Рагачоўскага раёну).

Вопыт гэтых калгасаў наглядна паўчыць, што няма ніякіх «аб'ектыўных прычын» для адставаньня, што ўся справа—у бальшавіцкіх мэтадах працы, ва ўменьні мабілізаваць масы на выкананьне іх абавязкаў перад дзяржавай.

Засталіся лічаныя дні. Яны павінны быць днямі рашаючай перамогі на вучастку збожжазагатовак па калгасным сэктары.

Калгасы Рагачоўшчыны выканалі толькі 48 проц. пляну здачы збожжа

РАГАЧОЎ.

Калгасы Рагачоўскага раёну павінны здаць дзяржаве 240 тон збожжа. На 5 сьнежня яны здалі толькі 118 тон, або 48 проц. пляну.

Недапушчальнае адставаньне калгаснага сэктару тлумачыцца тым, што па радзе сельсаветаў у калгасах не вядзецца літаральна ніякай работы вакол загатовак, няма рашучай барацьбы з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі, якія распальваюцца клясавым ворагам спрод адсталай часткі калгаснікаў.

Кулацкай агентуры ўдалося пралезьці ў некаторыя калгасы і нават стаць на чале іх. Так, старшыня калгасу **«Чырвоная Асінаўка»** (Старасельскі сельсавет) зьяўляецца кулацкім агентам, які ўсімі спосабамі імкнецца сарваць загатоўкі. Гэты калгас навіпен здаць дзяржаве 83 цэнтн. бульбы, аднак, праўленьне, падпаўшы цалкам пад уплыў кулака, адновілася ад выкананьня заданьня.

— Бульбы ў нас няма. Чым аддаваць яе па цьвёрдых цэнах дзяржаве, няхай лепш гніе, — заявіў старшыня калгасу.

Такой-жа «лініі» прытрымліваецца праўленьне калгасу і ў адносінах **да здачы збожжа.** Райкалгасаюз ня даў рашучага адпору рвацкім тэндэнцыям.

„Сакрэт" перамогі—у арганізацыі працы

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. (Нашк спец. кар.).

Калгасы імя Чарвякова, «Першае мая» і «Чырвоны араты» (Старасельскага сельсавету) паказалі ўзоры таго, як трэба змагацца за рэалізацыю заданьняў па збожжазагатоўках. Усе тры калгасы поўнасьцю выканалі плян здачы збожжа дзяржаве, прычым калгасы імя Чарвякова і «Першае мая» высунулі і ўжо ажыцьцявілі сустрэчныя пляны. Гэтыя-ж два калгасы ўжо скончылі здачу прадукцыі **па ўсіх іншых відах загатовак.**

Посьпехі, дасягнутыя гэтымі калгасамі, дапамогуць разьбіваюць усялякія разважаньні апартуністаў-кіраўнікоў з суседніх калгасаў **«Новы быт» і імя Будзённага** аб «немагчымасьці» адначасовага выкананьня заданьняў па ўсіх відах загатовак, аб «нерэальнасьці» тэрмінаў.

У чым «сакрэт» перамогі перадавых калгасаў? Зьвяртаемся **да калгасу імя Чарвякова,** які першым ня толькі ў сельсавеце, але і ў раёне выканаў плян загатовак.

Атрымаўшы плянавае заданьне, калгас цалкам пераключыў сваю работу на базавае ажыцьцяўленьне яго. У першую чаргу трэба было як найхутчэй абмалаціць збожжа. Праўленьне калгасу паставіла на абмалот тры поўскладаныя малатарні, якія працавалі з поўнай нагрузкай і штодзённа намалочвалі 80-100 цэнт. збожжа. Малацьба праходзіла ня толькі ўдзень, але і ўночы. Непасрэдна з-пад малатарні збожжа накіроўвалася на загатоўчы пункт. За 5 дзён калгас дабіўся абмалоту і здачы дзяржаве 32 тон збожжа, выпачаных плянавым заданьнем.

Правільная расстаноўка сіл была памножана на шырока разгорнутую масава-палітычную работу, на рашучую барацьбу з дробна-ўласьніцкімі спажывецкімі настроямі адсталых калгаснікаў за поўнае і першачарговае выкананьне абавязкаў перад пралетарскай дзяржавай. **Насьценгазэта калгасу была спэцыяльна прысьвечана пытаньням загатовак. Драмгурток арганізаваў спэктакль на гэту тэму. Пытаньне абгаворвалася на зьлёце актыву і на сходах калгаснікаў. Нарэшце, у калгасе быў праведзен пленум сельсавету з удзелам 200 калгаснікаў, на якім было шырока абмеркавана становішча загатовак.**

Выкананьне поўнасьцю сваё заданьне, калгас імя Чарвякова пераключыўся на дапамогу адсталым калгасам. Чарвякоўцы ўзялі на буксір калгасы **«Першае мая», «Шлях селяніна» і «Чырвоны араты»** і паміраваді туды дзіцярныя брыгады. Апошнія разгарнулі там ударную работу па абмалоце збожжа і вывелі адстаўныя калгасы на перадавыя пазыцыі загатоўчага фронту. На сёньняшні дзень **усе гэтыя** калгасы ўжо выканалі і перавыканалі свае заданьні.

Зусім іншы малюнак у калгасах **«Новы быт» і імя Будзённага,** дзе калгаснікі не мабілізаваны на першачарговае выкананьне заданьняў па здачы збожжа, на барацьбу з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі. Гэтыя калгасы ня выканалі нават і паловы пляну.

Калгас **імя Будзённага** засьмечан чужым, клясава-варожым элемэнтам, які рознымі спосабамі імкнецца сарваць выкананьне заданьняў. Старасельскі сельсавет зьняў з работы кіраўніцтва калгасу і паставіў правесьці чыстку яго ад кулацка-заможных элемэнтаў.

Раўняючыся па перадавікох загатовак, калгасы Заслаўскага раёну павінны разгарнуць сапраўды бальшавіцкія тэмпы здачы збожжа з тым, каб выканаць заданьні ў бліжэйшыя дні.

П. Арцельны.

Ачысьціць калгасы ад кулацкіх агентаў

БАРЫСАЎ.

Тэмпы збожжазагатовак па Барысаўшчыне зусім нездавальняючыя. На 5 сьнежня гадавы плян выкананы усяго на **57,8 проц.**

Асабліва адсталым вучасткам збожжазагатовак зьяўляецца **калгасны сэктар.** У той час, як індывідуальны сэктар выканаў заданьне на 84,9 проц., калгасы здалі толькі 46,7 проц. пляну.

Гэта вынік слабай, а месцамі поўнай адсутнасьці масава-растлумачальнай работы сярод калгаснікаў. Райкалгасаюз вельмі слаба змагаецца са скрыўленьнямі палітыкі партыі ў загатоўках з кулацкімі, рвацкімі тэндэнцыямі паасобных кіраўнікоў калгасаў.

Вось характэрны факт. За злосны зрыў загатоўчых плянаў райкалгасаюз паставіў зьняць з работы і аддаць пад суд старшыню калгасу **імя Будзённага тав. Нябышыньца.** З моманту вынясеньня гэтай пастановы прашло ўжо шмат часу, аднак райкалгасаюз не ажыцьцявіў яе і Нябышынец дагэтуль ня толькі ня прыцягнут адказнасьці, але і ня зьнят нават з працы. Праўленьне калгасу, на чале з Нябышыньцам, як і раней, ігнарыруе збожжазагатоўкі. Абмалочанае жыта два месяцы ляжыць у сырым месцы і ўжо пачало прарастаць, а заданьне па здачы збожжа дзяржаве ўсё яшчэ ня выканана.

Праўленьне калгасу **«Ўсход сацыялізму»** (Чарнеіцкага сельсавету), падпаўшы пад кулацкі уплыў, імкнецца рознымі спосабамі ўхіліцца ад выкананьня заданьня па збожжазагатоўках. Дагэтуль яшчэ ня скончан абмалот збожжавых культур. Зьняты ўраджай у большай частцы ляжыць пад адкрытым небам і гніе.

Трэба моцна ўдарыць па канкрэтных посьбітах рвацкіх, спажывецкіх тэндэнцый, выгнаць з калгасаў кулацкіх агентаў.

Федзін.

Працягнуць дэкаднік і ператварыць яго ў масавую кампанію

Барацьба за савецкую палітыку цэн—барацьба за аздараўленьне работы каапэрацыі і дзяржгандлю

Дэкаднік праверкі цэн—адзін з важнейшых сродкаў у барацьбе за выкараненьне нэпманскіх уплываў, за выкарчоўваньне апартуністычнай практыкі. Дэкаднік павінен дапамагчы ўзьняцьцю рэальнай заработнай платы рабочых, палепшыць іх абслугоўваньне.

Аднак, ход праверкі цэн паказаў, што большасьць каапэрацыйных і прафэсіянальных арганізацый БССР, асабліва на мясцох, недапацяніла значэньня гэтай важнейшай кампаніі і адносіцца да яе фармальна.

Белкаапсаюз сваю ролю абмежаваў рассылкай цыркуляру. Замест 90 чалавек, якіх меркавалася паслаць, Белкаапсаюз, ЦП саюзаў, Каапінстытут накіравалі ў раёны толькі... 6 чалавек. Зусім недапушчальную бязьдзейнасьць праяўляе ЦП саюзу каапэрацыі і дзяржгандлю, які вылучыў у брыгады толькі 3 чал., і не разгарнуў ніякай масавай работы. Ігнаруе дэкаднік і Наркамснаб.

Дэкаднік яшчэ не дайшоў да сельскіх спажыўтаварыстваў. Тое, што з раёнаў зусім няма вестак аб ходзе праверкі, сьведчыць аб тым, што ў гэтай галіне амаль нічога ня зроблена. Некаторыя раённыя каапэрацыйныя і прафэсіянальныя арганізацыі нават ня ўключыліся ў праверку.

Трэба адзначыць слабую ўвагу з боку раённага друку. Мясцовы-ж друк павінен быў асаблівую ўвагу аддаць гэтаму вучастку каапэрацыйнай работы.

Толькі ў Менску ў гэтай галіне праводзіцца больш-менш здавальняючая работа. У праверцы цэн прымаюць удзел 150 членаў гарсавету, студэнтаў, лёгкіх кавалерыстаў, а таксама 16 брыгад спэцыялістаў па калькуляцыі цэн. Абсьледвана ўжо значная колькасьць магазынаў гораду.

Рабочыя брыгады выкрылі абурачыя факты адвольнага перавышэньня напэнак, уздуваньня цэн і бескантрольнай калькуляцыі. Вось некалькі фактаў. Кілёграм масла каштуе ў Белгандлі 5 руб., у ЦРК і ЗРК мэталістаў № 4 руб. 30 кап. Белгандаль робіць націнку 25 проц., а ЦРК і ЗРК мэталістаў—8 проц. На шпапічную муку Белгандаль робіць націнку ў 17 проц., а ЗРК мэталістаў—12,5 проц. У магазыне Белгандлю украінская каўбаса прадаецца па 3 р. 35 кап. за кілё, у ЗРК мэталістаў—3 р. 20 кап. У магазыне гародніны Белкаапсаюзу № 2 паводле прэйскуранта ў вітрыне кілё мапасье каштуе 2 р., а фактычна прадаецца па 2 р. 10 кап. У магазыне Белгандлю цэны на салёныя гуркі былі павышаны з 36 кап. за кілё да 45 кап. Гэта павышэньне цэн на гуркі было зроблена таму, што некалькі бочак аказаліся сапсаванымі і загатчык магазыну парашыў перакласьці страты на кінэшно спажыўца.

У Воршы яблыкі ў розных магазынах прадаюцца па розных цэнах—ад 80 кап. да рубля. У магазыне № 6 Белкаапсаюзу пачка кофе з ніжняй паліцы прадаецца па 40 кап., а з верхняй—па 45 кап.

Трэба безадкладна дабіцца рашучага зруху ў ходзе дэкаднікa. Дэкаднік павінен быць працягнуты і ператвораны у масавую кампанію.

14-га сьнежня, роўна у 6 гадз. вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў Менгаркому КП(б)Б склікаецца **аб'яднаны пленум Менгаркому КП(б)Б і гарКК.**

Парадак дня:

1. Аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў (дакл. т.т. **Каранеўскі і Зданові**ч).

2. Аб перабудове работы гарадзкой арганізацыі ЛКСМБ і становішча партыйнага кіраўніцтва (дакл. т.т. **Янковіч і Грынкевіч**).

3. Пытаньні гарадзкой партыйнай канфэрэнцыі.

Апрача членаў і кандыдатаў гаркому, рэв. камісіі і гар. БК КП(б)Б, на пленум запрашаюцца: **па першым пытаньні** — сакратары калектываў маёў і вясковых парт'ячэек; **па другім пытаньні** — сакратары калектываў КП(б)Б і ЛКСМБ.

Бюро Менгаркому КП(б)Б.
Прэзыдыум Мен. Гар. КК КП(б)Б.

АПОШНІЯ ВЕСТКІ З ФРОНТУ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ

Выпушчан першы ў СССР паліровачны фрэзэр

Рапарт ЦК КП(б)Б, СНК БССР, ВСНГБ

ТАРФЯНАЯ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ БССР АТРЫМАЛА БУЙНУЮ ПЕРАМОГУ НА ШЛЯХУ МЭХАНІЗАЦЫІ ПАДРЫХТОЎЧЫХ РАБОТ.

РАБОЧЫЯ І АДМ.-ТЭХН. ПЭРСАНАЛ БАРЫСАЎСКАГА МАШЫНА-БУДАЎНІЧАГА ЗАВОДУ «ПРАЛЕТАРСІ МОЛАТ» РАЗАМ З ПРАЦАЎНІКАМІ ТАРФЯНОГА ІНСТЫТУТУ БЕЛТОРФУ—ВЫПУСЬЦІЛІ ПЕРШЫ Ў СССР ПАЛІРОВАЧНЫ ФРЭЗЭР (ДА ТРАКТАРУ «ФАРДЗОН-ПУЦІЛАВЕЦ»), ЯКІ ЗАМЯНЯЕ ПРАЦУ 100 ЧАЛ. У ДЗЕНЬ ПРЫ ПАЛІРОЎЦЫ ТАРФЯНЫХ БАЛОТ І ЗЬНЯЦЬЦІ АЧОСУ.

ПЕРШЫ ВОПЫТ РАБОТЫ ФРЭЗЭРА НА ТОРФАЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» ПАКАЗАЎ ДОБРЫЯ ВЫНІКІ. ДАЛЕЙШЫЯ ВОПЫТЫ ПА ЎДАСКАНАЛЕНЬНІ КАНСТРУКЦЫІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА.

КІРАЎНІК БЕЛТОРФАВ'ЯДНАНЬНЯ **АРНДТ.**
САКРАТАР ЯЧЭЙКІ КП(б)Б **БАБІЦКІ.**
СТАРШЫНЯ МК **ХУРСІК.**

Скончана будаўніцтва эле ватару ў Віцебску

1-га сьнежня скончана будаўніцтва магутнага элеватуру пры Віцебскім алейным заводзе. Элеватар ужо пушчан у ход.

Новая цагельня

У Менску пушчана ў ход новая буйная цагельня. Гадавая прадукцыя цагельні—28 млн. цаглін. Усе работы мэханізаваны. Будаўніцтва каштавала 2.300 тыс. руб.

Фарсунка для спальваньня фрэзэрнага торфу

Работнікам Інстытуту прамысловасьці інжынэрам **Цыпзровічам** скапструявана спэцыяльная фарсунка для спальваньня фрэзэрнага торфу. Канструкцыя гэтай фарсункі адрозьніваецца ад ад іншых тым, што яна зусім простая і танная.

Першыя вопыты скарыстаньня фарсункі на Белдзе[illegible] паказалі вялікую эфэктыўнасьць [illegible]тва.

У канцы сьнежня пускаецца ў ход ацэтонавы завод

Заканчваецца будаўніцтва і абсталяваньне вялікага ацэтонавага заводу ў Быхаве. У канцы сьнежня ён будзе пушчан у ход.

Ацэтонавы завод зьяўляецца адзіным у СССР па выпрацоўцы ацілавых і буцілавых сьпіртаў і ацэтонаў. Завод уваходзіць у лік 518 новых прадпрыемстваў, якія павінны быць пушчаны ў 1931 г.

Прадукцыя заводу—300 тон ацэтону і 700 тон ацілавых і буцілавых сьпіртаў у год. Выпуск гэтай прадукцыі пазбавіць тэкстыльную і гумовую прамысловасьць імпарту сырцу.

Брыгадзір камсамольскай ударнай брыгады пасажырскага цэху завода «Полымя рэвалюцыі» ДАРАШЭВІЧ.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

МАЦНЕЙ АГОНЬ ПА АПАРТУНІСТАХ, ЯКІЯ ПЕРАШКАДЖАЮЦЬ РАЗГОРТВАНЬНЮ САВЕЦКАГА ГАНДЛЮ

Поўнасьцю рэалізаваць дырэктывы партыі аб рабоце каапэрацыі

Пытаньні далейшага паляпшэньня матар'яльна-бытавых умоў і культурнага абслугоўваньня рабочых — сустаўная неадлучная частка асноўных мерапрыемстваў партыі, якія забясьпечваюць пасьпяховае выкананьне вытворчай праграмы. Гэтыя пытаньні занялі шырокае месца і мелі надзвычай выразнае адлюстраваньне ў лістарычнай прамове т. **Сталіна** аб новых уновах і задачах работы.

Посьпехі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і бесперапынны рост лёгкай індустрыі спрыяюць выкананьню пастаўленай задачы сыстэматычнага паляпшэньня рабочага спажываньня. Неабходна толькі пастойлівая барацьба за паляпшэньне якасьці работы каапэрацыі і шырокае разгортваньне савецкага культурнага гандлю, **выкарчоўваючы са зьвяньняў каапэрацыйна-гандлёвага апарату элементы бюракратызму, вытручаючы «непманскі дух», наносячы рашучы ўдар па апартуністычных скажэньнях дырэктыў партыі аб савецкім гандлі.**

Гэтыя скажэньні заключаюцца ў ігнараваньні правымі апартуністамі задач сацыялістычнага накапленьня, у імкненьні працягнуць розным мэтадам адносныя высокія нацэнкі і раздуць раздробныя цэны, у імкненьні сарваць рабочае забясьпячэньне, пашырыць гандаль па камэрцыйных цэнах і г. д. «Левы» апартунізм, які супрацілягаецца разгортваньню савецкага гандлю, прабуе ўстанавіць просты таваразабмен, ігнаруе гаспадарчы разрахунак, ня лічыцца з рэнтабэльнасьцю, сабатуе савецкую палітыку цэн і сацыялістычнае накапленьне, таксама імкнецца сарваць палітыку павышэньня дабрабыту працоўных.

Абавязак партарганізацый, і ў першую чаргу камуністаў, якія працуюць у апараце, магазыне, за прылаўкам, па-бальшавіцку мабілізаваць на ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых перад каапэрацыяй, на бязьлітасную барацьбу па два фронты. Рашаючым у гэтым зьяўляцца перабудова партыйна-масавай работы, правільная расстаноўка партсіл, якая забясьпечвала-б узмацненьне партыйнага ўплыву ва ўсіх зьвяньнях каапэрацыі, перабудова работы на аснове рэалізацыі высунутых т. Сталіным умоў.

Між тым многія партарганізацыі яшчэ не забясьпечылі сваёй работай належнай выразнасьці ў дзейнасьці каапэрацыйнага апарату. У паасобных парт'ячэйках наглядаецца нецярпімае **прымірэнцтва** да фактаў апартуністычнага скажэньня дырэктыў партыі ў галіне разгортваньня савецкага гандлю і правільнага праведваньня палітыкі цэн. Найгоршым праяўленьнем апартуністычнай практыкі ў даным выпадку зьяўляецца **парт'ячэйка магілеўскага ЦРК.**

Праўленьне магілеўскага ЦРК, захопленка буржуазнымі тэндэнцыямі «чыстага гандлю», **сыстэматычна павышала накладаньні на продажныя цэны тавараў, павялічвала выдаткі тавараазвароту, зусім ігнаруючы задачы сацыялістычнага накапленьня шляхам мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, разгортваньня самазагатовак, скарачэньня накладных выдаткаў і іншых мерапрыемстваў. Гэтыя захапленьні «непманскім духам» ня сустрэлі ніякага адпору з боку мясцовай партыйнай арганізацыі.**

Трэба сказаць, што фармальна-бюракратычныя мэтады ў праведваньні мабілізацыі сродкаў уласьцівы ня толькі аднаму магілеўскаму ЦРК. Былі факты масавага парадку, калі аб павялічэньні паю ці ўведваньні мэтавага паю на будаўніцтва прыгарадных гаспадарак рабочыя пайшчыкі даведваліся толькі праз апублікаваньне гэтага распараджэньня ў друку, ці ля прылаўку, калі прыходзілі за пакупкамі. З такімі фактамі недаацэнкі масавай работы і ігнараваньня грамадзкасьці неабходна пакончыць.

Зараз заканчваецца справаздачна-перавыбарчая кампанія бюро парт'ячэек і калектываў. З 10 сьнежня будуць праходзіць раённыя партканфэрэнцыі. Адным з важнейшых задач у рабоце падыходзячых партканфэрэнцый павінен быць усебаковы аналіз работы каапэрацыі, сканцэнтраваньне ўвагі партарганізацыі на задачах наўхільнага выкананьня дырэктыў партыі аб перабудове работы каапэрацыі і разгортваньні савецкага гандлю. У сыстэме мерапрыемстваў па ажыцьцяўленьні гэтага павінаюць выключнае значэньне пытаньні ўкараненьня гаспадарчага разрахунку ва ўсіх зьвяньнях каапэрацыі, ліквідацыі абязьлічкі ў рабоце і дробна-буржуазнай ураўнілаўкі, падрыхтоўкі кадраў каапэрацыйных работнікаў і аўладаньня тэхнікай савецкага гандлю. Каапэрацыйныя парт'ячэйкі і прафсаюзныя арганізацыі абавязаны **неадкладна ўключыцца ва ўсесаюзны рэйд праверкі рэалізацыі ўказаньняў т. Сталіна і ажыцьцяўленьня пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б).**

У палоне апартуністычнай практыкі

На справаздачна-перавыбарчым сходзе парт'ячэйкі **магілеўскага** ЦРК выкрыт цэлы рад недахопаў у рабоце і фактаў апартуністычнага скажэньня дырэктыў партыі аб рабоце каапэрацыі. Мы падкрэсьліваем, што гэтыя недахопы былі выкрыты па перавыбарчым сходзе, бо падрыхтоўчай, самаправерачнай работы да часу перавыбараў фактычна не праводзілася. Самаправерачную работу бюро ячэйкі даручыла правесьці... аднаму члену партыі, абмежаваўшы яго 2-3-дзенным тэрмінам. Ужо з гэтага відаць, як кіраўніцтва ячэйкі фармальна, па-казённаму аднеслася да праведваньня важнейшай палітычнай кампаніі.

Такія адносіны да праведваньня перавыбарчай кампаніі парторганаў не выпадковы. Элементы фармальных адносін да работы, апартуністычная стаўка на самацёк мелі месца на працягу ўсёй дзейнасьці ячэйкі за справаздачны пэрыяд. Ячэйка пытаньнямі перабудовы работы каапэрацыі фактычна не займалася, а калі і займалася, дык павярхоўна, а ў радзе выпадкаў зусім фармальна.

У ліпені гэтага году бюро ячэйкі на сваім пасяджэньні паставіла пытаньне аб перабудове партыйна-масавай работы. Пагаварыўшы «наогул» аб перабудове, бюро ячэйкі даручыла аднаму партыйцу «ў трохдзены тэрмін выявіць, колькі працуе камуністаў у крамах і магазынах, і далажыць аб гэтым на бюро». Нават і гэта даручэньне ня было выканана, і кіраўніцтва ячэйкі больш не вароча лася да пытаньняў перабудовы сваёй работы. Дырэктыва партыі аб тым, каб **«пры ўсіх буйных і сярэдніх магазынах і складах усёй сеткі спажывецкай каапэрацыі арганізаваць самастойныя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, падпараднаваныя непасрэдна гаркому і райкому партыі»,** ня выканана. Вінаватым у гэтай справе зьяўляецца і заг. арганадзелу РК КП(б)Б тав. **Фідзэльман** які выступіў супроць арганізацыі ячэек у буйнейшых магазынах.

Важнейшыя дырэктывы партыі аб перабудове каапэрацыі, як адозва ЦК і СНК, не знайшлі практычнага пераламеньня ў рабоце парт'ячэйкі. Не прапрацаваны яшчэ і да гэтага часу пастановы кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б). Ячэйка шукала сякія-такія мерапрыемствы для паляпшэньня абслугоўваньня рабочага спажыўца, але да канца іх не даводзіла.

Да пашырэньня сеткі крам праўленьне ЦРК аднеслася фармальна. Праўда, гэта сетка ў цэнтры гораду значна пашырана, а акраіны, заселеныя пераважна рабочымі, выпалі з-пад увагі праўленцаў. Ніякіх захадаў для зьнішчэньня чаргі ў крамах ня ўжываецца.

Ні праўленьне ЦРК, ні парт'ячэйка нічога не зрабілі ў напрамку арганізацыі самазагатовак, апартуністычна ігнаруюць гэту задачу. Старшыня праўленьня **Файн** на запытаньне брыгады «Камунара Магілеўшчыны» аб ходзе самазагатовак адказаў: «Загатовак нельга праводзіць да таго часу, пакуль ня будзем мець выстарчальнай колькасьці прамтавараў для прэміраваньня здатчыкаў». Па апартуністычнай сьцежцы Файна ідзе і сакратар парт'ячэйкі **Сьліўкін,** які спасылаецца на адсутнасьць сродкаў для разьвіцьця самазагатовак.

Ячэйка за мінулы год ні разу не паставіла пытаньня аб мабілізацыі сродкаў. Паянакапленьне, збор мэтавых узносаў праводзіцца бяз усякай папярэдняй растлумачальнай работы сярод пайшчыкаў. Выплату мэтавых узносаў праўленьне ЦРК увяло бюракратычным росчаркам пяра, не правёўшы загадзя ні на адным прадпрыемстве растлумачальнай работы ў гэтым пытаньні.

Праўленьне МЦРК ішчэ да гэтага часу ня выкупіла авансавых талёнаў на капусту і бульбу за 1930 год на суму 8.000 руб. У результаце гэтага сёлета праўленьнем ЦРК замест плянавых 32.000 рублёў, якія павінны былі быць сабраны авансам на гародніну, сабрана толькі 686 рублёў.

Пляны тавараазвароту магілеўскім ЦРК ні за адзін квартал ня выкананы. У той час, калі на складах ляжыць замарожанага тавару на сотні тысяч рублёў. **Праўленьне ЦРК у пагоні за высокімі прыбыткамі груба парушыла палітыку цэн.** Праўленьне з месяца ў месяц павялічвала процант накладаньняў на прадажную цану тавараў. У студзені гэта накладаньне выявілася ў 10,06 проц., у лютым—11,98 проц., у сакавіку—12,2 проц., у маі —13,41, у чэрвені—16,17 проц. і жніўні-верасьні—14,25 проц. Такое-ж становішча і з устаноўленьнем накладных выдаткаў. У процівагу дырэктывам партыі аб сыстэматычным **зьніжэньні** накладных выдаткаў магілеўскі ЦРК гэтыя выдаткі сыстэматычна павышае.

Праўленьне магілеўскага ЦРК і парт'ячэйка літаральна нічога ня ўжылі для ажыцьцяўленьня ў сваёй рабоце шасьці ўмоў тав. Сталіна. Як у рабоце праўленьня ЦРК, так і раду яго пізавых зьвяньняў папуе абязьлічка, ня ўведзен гаспадарчы разрахунак.

З усіх паданых фактаў вынікае адзін вывад, што ў рабоце магілеўскага праўленьня ЦРК і парт'ячэйкі пераважае апартуністычная практыка, адсутнасьць бальшавіцкай барацьбы з апартуністычнымі скажэньнямі лініі партыі. Патрэбны рашучыя захады з боку магілеўскага РК КП(б)Б для аздараўленьня работы праўленьня ЦРК.

Брыгада друку: Прахарэнка, Скапец, Рахлін.

Уключыцца ва ўсесаюзны рэйд

У сувязі з праведзеньнем усесаюзнага рэйду па праверцы рэалізацыі ўказаньняў тав. Сталіна і пастаноў Кастрычніцкага пленуму ЦК УсеКП(б) у Бабруйску праведзен агляд работы каапэрацыйных і гандлёвых устаноў.

Агляд паказаў, што рад крам ЗРК пры дапамозе зьдзельшчыны, ліквідацыі ўраўнілаўкі і абязьлічкі і дабіўся значных вынікаў у сваёй рабоце. Павысілася зацікаўленасьць работнікаў апарату да выкананьня даручаных абавязкаў, павялічыўся таваразварот. Палепшыліся адносіны да спажыўца.

Аднак, вопыт лепшых крам ЗРК не перанесен на ўсю каапэрацыйную і гандлёвую сетку гораду і раёну. У значнай частцы крам ЦРК галінавых аб'яднаньняў Белкаапсаюзу, Белгандлю і Беллодагародніны яшчэ да гэтага часу ня ўведзена прэміяльна-зьдзельная аплата работы, краме не праведзены на гаспадарчы разрахунак.

Паасобныя кіраўнікі каапэрацыйнага апарату недаацэньваюць ролі крамных работнікаў у барацьбе за павышэньне якасьці каапэрацыйных тавараў. Загадчыкі крам № 3 і 17 лічаць, што за якасьць тавараў павінны адказваць толькі працаўнікі складу.

Зусім мала аддаецца ўвагі пытаньням рацыяналізацыі працы з тым, каб канчаткова зьнішчыць чаргі. Папярэдняе разважваньне і фасоўка тавараў большасьцю крам ня робіцца. У крамах Беллодагародніны вельмі дрэнная якасьць тавараў.

Слаба разгорнута работа па аўладаньні тэхнікай савецкага гандлю. Каапэрацыйная сыстэма невыстарчальна займаецца самазагатоўкамі. Усё гэта зьяўляецца вынікам таго, што партыйныя арганізацыі гэтых устаноў не перабудавалі сваёй работы, не расставілі правільна партыйных сіл, не пераключыліся на апэрацыйнае і канкрэтнае кіраўніцтва работай пізавых зьвяньняў каапэрацыі і гандлю. Каапэрацыйныя парт'ячэйкі нічога не зрабілі для таго, каб папулярызаваць сярод работнікаў каапэрацыі пастановы кастрычніцкага пленуму. **М.**

Аб „апартуністычным бяльме" і „сьляпым розуме" аднэй газэты

(**„Калектывіст", Чэрвеньскі раён**)

Спачатку неабходна некаторае храналёгічнае адступленьне.

Вядомы працэс «66» у Чэрвені, арганізаваны агентурай кулацтва, у свой час ускалыхнуў усю грамадзкасьць. Справа «66» — факты, параўнаўча, нядаўных дзён. Чэрвеньскія судзьдзі —шчырыя выканаўцы гэтай кулацкай правакацыі, пасадзілі па лаву падсудных 66 ні ў чым нявінаватых калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

Раённыя арганізацыі, так сказаць, маўчалі. Антысавецкую вылазку кулака, змайстраваўшага сваю правакацыю рукамі правых апартуністаў, і райком партыі і яго орган — **«КАЛЕКТЫВІСТ»** спаткалі кругавой змовай маўчаньня. Іх клясавая сьлепата, бяспрэчна, не магла не падбадзёрыць чэрвеньскіх прадстаўнікоў суда.

Шыла ў мяшку не схаваеш. Праз 42 дні пасьля першага судовага разбору «Калектывіст» раптоўна забіў трывогу. Але, як!

Голас рэдакцыі прагучэў з яўна **правых пазыцый.** Уся справа, бачыце, **ТОЛЬКІ** ў «бюракратызьме, агіднейшым бюракратызьме». Рэдакцыя старанна змазала яўна кулацкую падаплёку справы. Ні адным словам «Калектывіст» не падкрэсьліў, што працэс «66» — паглая вылазка правых апартуністаў, прадыктаваная кулаком. А адсюль і адпаведная ацэнка:

— СПРАВА «66» — АГІДНЕЙШЫ ФАКТ БЮРАКРАТЫЗМУ

(№ 23, 5 чэрвеня)

За ацэнкай пасьледваў вывад:

«Справа «66» павінна прымусіць удзесяцярыць нашу пільнасьць да малейшых праяў бюракратызму».

Газэту, як бачыце, хвалююць толькі «праявы бюракратызму». Правых апартуністаў — арганізатараў працэсу і іх натхніцеля — клясавага ворага, — «Калектывіст» ня бачыць. Мабілізаваць масы на барацьбу з імі рэдакцыя не памерана.

Чэрвеньскі суд газэта патурбавала «грозным пытаньнем»:

«...чаму была разьведзена такая цяганіна па выкліку і працэсе над «66», ня маючы абсалютна ніякіх падстаў для іх абвінавачваньня»

«Расправу» над бюракратызмам «Калектывіст» правёў у позе адважнага выкрываўцы. Рэдакцыя пры гэтым скромна прамаўчала, што яе «выкрыць ні» спазьніліся больш чым на 40 дзён. Сваё выступленьне па справе «66» «Калектывіст» завяршыў дыпляматычным патрабаваньнем:

«вінаватых (імёнаў няма. Рэд.) **прыцягнуць да самай суровай адказнасьці!..»**

Уласныя вывады і ацэнку рэдакцыя зьмяніла на дзіва хутка. Бюракратызм шпарка быў заменен «рэшткамі капіталізму». Праз нумар «Калектывіст» (пасьля таго, як справай «66» заняліся вышэйшыя арганізацыі і да канца выкрылі яе сапраўдную палітычную сутнасьць) загаварыў ужо ў зусім іншым тоне:

«Справа «66»—НЕ БЮРАКРАТЫЗМ, а ХІТРАЯ ВЫЛАЗКА КЛЯСАВАГА ВОРАГА. Каб ня бачыць гэтага, трэба мець апартуністычнае бяльмо на вачох і быць палітычна сьляпым на розум. На новую вылазку клясавага ворага адкажам новым калгасным прыбоем, выкарчоўваючы з карэньнем рэшткі капіталізму» (№ 25).

Гнеўныя заявы аб «сьляпым розуме» і «апартуністычным бяльме» рэдакцыя «Калектывіста» ні ў якой меры аднак **НЕ АДНОСІЛА** на свой рахунак. Нязважна, што газэта на працягу 42 дзён ганебна маўчала аб справе «66», а потым далажэй праваапартуністычную ацэнку. Гэтыя факты «Калектывіст» палічыў нястотнымі і нявартымі таго, каб пра іх гаварыць.

Рэдакцыя з глыбокім абурэньнем надзяліла «сьляпым розумам» усіх каго хочаце, толькі не сябе. Аб сваіх памылках, аб сваёй бязьмежнай клясавай сьлепаце законны ўладар «апартуністычнага бяльма» **НЕ СКАЗАЎ НІ СЛОВА.**

«Калектывісту» **ПАШАНЦАВАЛА.** Чэрвеньскі райком спакойна прайшоў міма памылак рэдакцыі. Па іх ніхто ня ўдарыў. Райком фактычна дапамог свайму органу замазаць яго антыпартыйны манэўр...

— Зусім нядаўна ў Чэрвеньскім раёне выкрыты грубейшыя «лявацкія» загібы. Як відаць з матар'ялаў РКК, апублікаваных у «Калектывісьце» (№ 56, 28 лістапада) у Руднянскім сельсавеце гэтага раёну «лявацкая» практыка **СТАЛА СЫСТЭМАЙ.**

Злачынныя парушэньні рэвалюцыйнай законнасьці ў сельсавеце да самага апошняга часу былі звычайнай справай. Упаўнаважаны РК КП(б)Б Сакалоўскі разам з групай іншых партыйцаў на працягу некалькіх месяцаў ажыцьцяўлялі сваю «лявацкую» практыку у самых агідных, у самых нагалых формах. Сакалоўскі з сябрамі стварылі «надзвычайную камісію», якая з усёй сілай праявіла свае «лявацкія» здольнасьці. Поўнамоцтвы гэтай «камісіі» меры ня ведалі. Абнаглелая кулацкая агентура даходзіла да таго, што забірала маемасьць у паасобных серадняко́ў. Чэрвеньскія «левакі» штрафавалі некаторых сялян па 1.000-2.000 руб.

28 лістапада райком і РКК апублікавалі сваю пастанову па гэтай справе. «Калектывіст» вышаў са спэцыяльнай перадавой.

Дзе былі раней і райком і газэта, на вачох якіх «левакі» праводзілі сваю кулацкую работу, **НЕВЯДОМА.** Адказу не даюць і ні пастанова райкому, ні перадавая газэты. Хаця «Калектывіст» сам адзначае, што

«...варожая вылазка кулака праз яго агентаў у Руднянскім сельсавеце вынікла не выпадкова. Яна здарылася, як гэта выявіла РКК, у сельсавеце, насычаным «лявацкай» практыкай, у сельсавеце, дзе перагібы і адміністраваньне ўвайшлі ў сыстэму работы».

Зноў як і ў справе «66» «Калектывіст» апынуўся ў хвасьце падзей. «Апартуністычнае бяльмо», набытае рэдакцыяй пры працэсе «66», аказалася даволі моцным...

Пад свой перадавы артыкул «Калектывіст» сьпяшаецца перш за ўсё падвесьці грунтоўную «тэарытычную» базу. Веды рэдакцыі праяўляюцца надзвычай ярка.

«Наша рэвалюцыйная законнасьць,—піша «Калектывіст» — **ёсьць увасабленьне лёзунгаў і дырэктыў партыі ў дзяржаўнай форме...»**

Выпаходзтва, вартае яго аўтараў! Чаго толькі каштуе адзін стыль, ня кажучы аб поўнай **БЯЗГЛУЗДАСЬЦІ** зьместу. Змайстраваўшы «дзяржаўную форму», «Калектывіст» пераходзіць да вываду.

І тут настрой газэты рэзка мяняецца. На зьмену «тэарытычным» практыкаваньням прыходзіць бязьмежная паніка. «Калектывіст» узяў пад сумненьне... саюз усёй рабочай клясы з серадняком (!).

Камэнтуючы пастанову РК аб выключэньні Сакалоўскага і яго сяброў з партыі, «Калектывіст» з глыбокім пэсымізмам піша:

«Бюро райкому і прэзыдыум РКК далі адпаведную палітычную ацэнку злачынствам Сакалоўскага, Рудзінскага і інш. і зрабілі правільныя аргвывады.

Другіх вываду партыя зрабіць не магла. Ужо занадта вялікія злачынствы перад рэвалюцыяй і партыяй зрабілі яны. Яны дапамаглі кулаку ПАСВАРЫЦЬ СЕРАДНЯКА З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ, ПАСЛАБІЦЬ ІХ САЮЗ».

Вывады, так сказаць, камэнтараў не патрабуюць. Яны зусім відавочны. «Калектывіст» ня толькі выпаходца «форм» для лёзунгаў партыі, але і дасканалы майстар «лявацкіх» палёпнаў. У страха вочы вялікія...

Для сваіх думак аб «увасабленьні» «Калектывіст» знайшоў і месца і час. Іншая справа такое пытаньне, як скажам, чаму раённыя арганізацыі рэагавалі на «лявацкія» перагібы з такім ганебным спазьненьнем. Тут і газэта і райком партыі **АДНАЎЛЯЮЦЬ** знаёмую змову маўчаньня...

— Стары маньёр зноў пускаецца ў ход. «Калектывісту» яшчэ раз шанцуе. Зноў зьмясьціўшы артыкул, па сутнасьці **ПАЛІТЫЧНА ШКОДНЫ,** рэдакцыя «Калектывіста» і ня думае яго выпраўляць. Ня думае і райком. Пасьля 28 лістапада выйшлі ўжо два новыя нумары, а ў іх аб памылках «Калектывіста» — ні слова.

ГІСТОРЫЯ ПАЎТАРАЕЦЦА. Шанцуе «Калектывісту», шанцуе...

З апошняй пошты

Так нельга мабілізаваць партыйныя арганізацыі

Бяспрынцыпнае, антыбальшавіцкае прымірэнцтва зьяўляецца небясьпечным і шкодным саюзьнікам і запаможнікам усіх відаў апартунізму. Ня можа быць пасьпяховага змаганьня супроць правых і «левых» апартуністаў без рашучага змаганьня супроць прымірэнцтва, супроць «ліберальных адносін» да ўсіх і ўсялякіх скажэньняў партыйнай лініі.

«Зьвязда» ў нумары ад 30 лістапада ў рэцэнзіі на брашуру т. Л. Гуровічэ да перавыбараў парторганаў з усёй выразнасьцю выкрыла палітычныя памылкі, якія былі зроблены аўтарам брашуры. У рэцэнзіі было паказана на недагушчальнасьць забываньня барацьбы супроць прымірэнцтва. Аднак, ня ўсе зрабілі з гэтага адпаведны ўрок.

Газэта **«Савецкая Беларусь»** у № 282 ад 8 сьнежня зьмяшчае перадавую «За баявую падрыхтоўку да раённых партканфэрэнцый». Тэма надзвычай адказная. Здавалася-б, што, зьмяшчаючы артыкул на гэту тэму, газэта паставіць усе тыя актуальнейшыя пытаньні, якімі зараз жыве партыя.

Сваім зьместам перадавы артыкул робіць спробу падвесьці папярэднія вынікі справаздачна-перавыбарчай кампаніі і высунуць перад партыйнымі арганізацыямі задачы, што паўстаюць у сувязі з падыходзячымі райпартканфэрэнцыямі.

Аднак, перадавая не мабілізуе парторганізацый на бязьлітаснае змаганьне супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць усялякіх скажэньняў партыйнай лініі. Аб гэтым мы ў канцы артыкулу маем адну толькі фразу. Аўтар перадавой «умудрыўся» ні слова не сказаць аб барацьбе супроць прымірэнцтва да правых і «левых» апартуністаў. Ён зусім моўчкі абышоў пытаньні ленінскай нацыянальнай палітыкі. Як можна было забыць аб гэтых важнейшых пытаньнях? Цэнтральны Камітэт КП(б)Б у сваім лісьце да перавыбараў парторганаў выразна падкрэсьлівае, што справаздачна-перавыбарчая кампанія павінна ўзьняць на вышэйшую ступень практычную работу партыйных арганізацый па ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, па мабілізацыі мас на змаганьне супроць ухілу ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, нацыянал-апартунізму і шавінізмаў іншых колераў. У лісьце ЦК КП(б)Б выразна падкрэслена аб неабходнасьці самага жорсткага змаганьня супроць прымірэнцтва да ўхілаў ад лініі партыі.

«СБ» у сваім перадавым артыкуле піша: «Перавыбары парторганаў далі значны рост партыі за кошт лепшых рабочых-ударнікаў» і ні слова не гаворыць аб тым, што задача партыйных арганізацый зараз заключаецца ў тым, каб даць бальшавіцка-ленінскае выхаваньне новаму папаўненьню, каб уцягнуць яго ва ўнутры-партыйную работу.

Артыкул ні ў якай меры не мабілізуе партыйных арганізацый на барацьбу за выразнае праведзеньне генеральнай лініі партыі, замоўчвае пытаньні барацьбы супроць буржуазных перараджэнцаў, якія выяўленыя ў сувязі з праведзеньнем загатоўчай кампаніі. Артыкул паказвае, як ня трэба праводзіць работы па мабілізацыі партыйных мас вакол вузлавых задач да партыйных канфэрэнцый.

Ю. Ленскі

Ад „пацыфікацыі" да ваенна-палявых судоў*)

У супроцьстаўленьне вялізарнейшым посьпехам сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе сусьветная капіталістычная гаспадарка корчыцца ў ціскох крызісу, трапчыць па ўсіх швох. Сьледам за аграрным і прамысловым крызісам крызіс фінансавы набывае катастрафічныя разьмеры. Пасьля фінансавай катастрофы Германіі прышла чарга да Англіі. Крах ангельскага фунта абвастрыў эканамічны крызіс асабліва ў краінах, залежных ад лёндзкай фінансэры.

Як картачныя домікі валяцца магутныя банкі, вялікія міжнародныя канцэрны.

Ва ўсіх капіталістычных краінах узмацняецца супраціўленьне працоўных мас узвальваньню на іх плечы цяжару крызісу. Супраціўленьне гэта перарастае ў вялікія баі паміж працай і капіталам, дэзарганізуючы апарат імпэрыялістычнага панаваньня. Такі характар меў нядбывалы ў гісторыі ангельскага імпэрыялістычнага бунт маракоў, накіраваны супроць «апчаднай» палітыкі каліцыйнага ўраду з Макдональдам на чале. Бунт у ангельскім флёце, задача якога (флёту) стаяць на варце імпэрыялістычных пазыцый Англіі, душыць рэвалюцыйны рух калёніяльных народаў і ангельскага пралетарыяту, устрывожыў усю міжнародную буржуазію. Ангельскія маракі сталі ў рады пралетарыяту, які змагаецца. Паражэньне адміралітэ і ўраду Англіі сыгналізуе разлажэньне ваенных сіл міжнароднага імпэрыялізму.

Дарэмна фашысцкі ўрад Польшчы стараецца рабіць міну, сьцьвярджаючы, што Польшча працягвае сабою за цінны куток у капіталістычным сьвеце. «Калі мы бачым вялікія сацыяльныя рухі, з якімі нават дзяржавы, добра з'арганізаваныя, ня вельмі даюць сабе рады, дык ці не зьяўляецца шмат азначаючым тое, што ў Польшчы мы маем поўны спакой!... адсутнасьць якіх-небудзь рухаў масавага характару?» — заўляе Мядзінскі на зававодзкім зьезьдзе ББ у Вільні, па вялікае, напоўна, зьдзяйсьненае далегатаў. Але фіглярскія запэўненьні Мядзінскага ня могуць супакоіць польскіх капіталістаў і памешчыкаў, якім рэвалюцыйны рух дае сябе ўсё больш значна адчуваць.

Польская буржуазія, адчуваючы, што пад **нагамі** гарыць глеба, зьбірае ўсе свае сілы, каб перажыць падыходзячую зіму. **Супроць нарастаючай пралетарскай рэвалюцыі зьмыкаецца буржуазны фронт контр-рэвалюцыі, адбываецца прысьпешаныя тэмпамі мабілізацыя ўсіх сіл і сродкаў для барацьбы з рэвалюцыйным рухам.**

«Грозныя і пануры сьнілы пачуліся, — грыміць орган прамыслоўцаў — «Кур'ер польскі», — ня трэба іх ігнараваць. Трэба рашуча дуньць усякія выступленьні як антыдзяржаўных вулічных банд, так і камуністычных інтэлігентаў, якія атручваюць сацыяльную атмасфэру. Зіма павінна застаць урад і грамадзянства гатовымі на ўсякія няпрыемнасьці».

Яшчэ больш панурыя думкі выказаў «Кур'ер Віленскі» «ў гадавіну бойкі пад Варшавай»:

«Барацьба, якая здавалася нам закончанай над берагамі Віслы ў 1920 годзе, ня сьціхла, ня спынілася ні на хвіліну і сёньня прадстаўляецца ва ўсёй сваёй напружанасьці. Трэба спыніцца на тым, наколькі за мінулыя 11 год узмацніліся яны там на Прывольскіх стэпах і наколькі ўзмацніліся мы? Колькі здабылі саюзьнікаў яны і колькі мы? **На жаль, яны здабылі вельмі многа... здабылі шмат.** Як 11 год назад, так і цяпер, мы стаім на небясьпечным бастыёне, а **пад нагамі нашымі палае зямля...** Зіма, якая набліжаецца, будзе ня толькі пералоўнай з пункту гледжаньня палітыкі міжэўрапэйскай, **але і ўнутры краіны. Гэту бойку, якая вырашаецца штодзенна на працягу доўгіх месяцаў, магчыма нават больш цяжкую, чым мінулая, мы таксама павінны выйграць».**

Гэта завеща цьвярозым падлікам сіл... Бойка паміж сацыялізмам і капіталізмам, якая ў 1920 годзе вырашалася на берагах Віслы, вядзецца сёньня са значна большай сілай і з большымі шансамі для сацыялізму, які рэалізуецца ў СССР. Бойка гэта вядзецца сёньня ў першую чаргу на ўнутраным фронце і зьяўляецца больш цяжкай для перамогі. Каб яе выйграць, трэба папярэдзіць наступленьне ўнутранога ворага і, такім чынам, забясьпечыць сабе тылы ў розыгрышы з вонкавым ворагам.

Так разумее гэта ўся польская буржуазія.

Таму фашысцкі ўрад у барацьбе з рэвалюцыйным рухам абвастрае мэтады грамадзянскай вайны супроць працоўных мас і хапаецца за розныя сродкі для зьнішчэньня камуністычнага авангарду. «Пацыфікацыя», новы турэмны рэгламант, ваенна-палявыя суды павінны быць такімі папараджальнымі сродкамі перад падыходзячай пралетарскай рэвалюцыяй. Ваенна-палявыя суды — гэта на справе «легалізацыя» сыстэмы пацыфікацый, якія пашырыліся на ўсю краіну. Ваенна-палявыя суды — гэта апачатасова ваеннае становішча ў сувязі з ваеннай падрыхтоўкай супроць СССР.

Ваенна-палявыя суды б'юць ня толькі па камуністах, але таксама і па шырокіх масах, якія пераходзяць да больш непасрэдных форм барацьбы, асабліва на Заходняй Украіне і Беларусі, дзе фашысцкі рух хоча задушыць нацыянальна-вызваленчы рух. Ужо сама практыка ваенна-палявых судоў (у часе вайны з Савецкім Саюзам) гаворыць аб тым, як шырока польская буржуазія ўжывае гэту зброю ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам. Ваенна-палявым судом падлягаюць ня толькі ўсе ўдзельнікі тэрарыстычных актаў, але і ўдзельнікі натоўпаў пры такіх актах, г. зн. у рабочых і сялянскіх маніфэстацыях; захоўваньне зброі таксама падлягае ваенна-палявым судом. Пад формулы «гвалтоўных актаў» будзе падводзіцца ўсякае супраціўленьне замахам капіталу, падатковаму і камасацыйнаму грабяжу, усякія праяўленьні забастовачнай барацьбы. Праз некалькі дзён пасьля абвяшчэньня ваенна - палявых судоў, дырэкцыя фабрыкі «Герцфэльда і Вікторыус» у Грудзёндзы пагражала рабочым карай сьмерцю за забастоўку.

Дэкрэт аб ваенна-палявых судох **ва ўсёй дзяржаве** гаворыць аб тым, як моцна буржуазія і яе фашысцкая дыктатура адчуваюць пагрозу з боку рэвалюцыйных рабочых, сялян і прыгнечаных народаў. Але дэкрэт гэты таксама гаворыць аб вялікай небясьпецы, якая пагражае шырокім народным масам, што змагаецца супроць узвальваньня цяжараў крызісу на іх плечы, супроць фашысцкай дыктатуры і польскай акупацыі, супроць капіталістычнага ладу. Нельга нам перапамяшчаць гэтай небясьпекі.

Барацьба супроць ваенна-палявых судоў высоўваецца сёньня на першае месца нашай КПП. Партыя павінна ва ўсёй краіне арганізаваць масавы адпор ваенна-палявым судом і крывавай пацыфікацыі. Нельга забывацца ні на хвіліну, што наша слабасьць дадала-б сьмеласьці фашызму.

Непадзельнай часткай нашай акцыі супроць ваенна-палявых судоў павінна быць дэмаскаваньне сацыял-фашыстаў і нацыянал-фашыстаў, галасамі якіх быў прапушчан закон аб ваенна-палявых судох супроць рэвалюцыйнага руху. Выступаючы цяпер на словах супроць ваенна-палявых судоў, сацыял-фашызм усхвалене перад масамі парляментарную дэмакратыю, як гарантыю «справядлівых судоў». Наша партыя павінна пры дапамозе канкрэтных фактаў, узятых з мінуўшчыны, дэмаскаваць гэта супроцьстаўленьне розных форм буржуазнай дыктатуры. Трэба па помніць масам, як гэта ў часы «парляментарнай дэмакратыі» ваенна-палявыя суды расстрэльвалі рабочых, абвінавачаных у «здрадзе стану», як пагражалі расстрэламі або павешаньнем бастуючым чыгуначнікам, як, нарэшце, без усялякіх судоў катавалі бастуючых сельска-гаспадарчых рабочых. Трэба паказаць, што і сёньня, ня гледзячы на «рэвалюцыйныя» фразы, сацыял-фашызм зьяўляецца галоўнай апорай ураду, які ўжывае ваенна-палявыя суды супроць рабочых і сялян.

Ваенна-палявыя суды маюць на мэце запалохаць масы, якія ўступаюць на шлях рэвалюцыйнага выхаду з крызісу, адмежаваць і адарваць іх ад камуністычнай партыі. Наша асноўная задача — узмацніць сілы для сканцэнтраваньня выступленьняў паасобных атрадаў нарастаючай пралетарскай рэвалюцыі, для злучэньня барацьбы рабочых з барацьбой беспрацоўных, для ўвязваньня пралетарскай барацьбы з сялянскімі выступленьнямі, а таксама рэвалюцыйнага руху ў Польшчы з нацыянальна-вызваленчым рэвалюцыйным рухам на Заходняй Украіне і Беларусі.

Надыходзіць час спробы, час рашаючых баёў. Тут ужо не задавальняюць старыя тэмпы работы, звычайная актыўнасьць партыйных арганізацый. Наша партыя, загартаваная дзесяткамі гадоў гераічнай барацьбы, дасьць адпор і ваенна-палявым судом. Але гэтага мала. Найважнейшае — гэта ўзьняць актыўнасьць партыі на такую ступень, якое вымагае цяпы перыяд нарастаньня частковых баёў у рашаючыя баі за ўладу, за зьвяржэньне капіталізму. Найважнейшае — гэта пераход штодзенных баёў разгорнутым фронтам у рэвалюцыйнае контр-наступленьне супроць усёй сыстэмы фашысцкай дыктатуры буржуазіі, гэта — павышэньне баявой здольнасьці кожнага зьвяна партыі.

*) Канец. Пачат

РАБОТА ПУНКТАЎ АБМЕНУ НЕ НАЛАДЖАНА

Рамонтныя заводы і дарогі павінны забясьпечыць пункты запаснымі часткамі і матар'яламі

Менскі пункт працуе дрэнна

У працы абменнага пункту ст. **Менск** ёсьць буйныя недахопы. Штат пункту поўнасьцю не ўкамплектаваны. Гаспадарчы разрахунак, зьдзельная аплата працы не праводзяцца. Партклектыў і мясцком цягі справай арганізацыі работы абменнага пункту не займаліся. Майстэрань, зварачных апаратаў і інш. пункт ня мае.

Не хапае запасных частак: гаек спружнёвых, валікаў рэсорных, шпілін тоў, спружын буферных, лахавага жалеза, рукавоў з штуцэрамі торм. вэсьцінгаўза, цяг тормазных, сьцержняў буферных і інш., адсутнасьць якіх прыводзіць да невыкананьня запісаў рамонту вагонаў.

Кантора пункту абмену, дзе знаходзяцца запасныя часткі, зьмяшчаецца па адлегласьці паўкілёмэтра ад шляхоў абмену. Рабочыя пункту заяўляюць, што за час дзяжурства ім прыходзіцца больш хадзіць за інструментам і запаснымі часткамі, чым працаваць.

Не наладжана пытаньне аб тым, каб дзяжурныя па станцыі своячасова паведамлялі пунктам аб гатоўнасьці да агляду перадачы. Не паказваюцца ў заўках нумары першага і апошняга вагону, што перашкаджае рамонту і можа прывесьці да здарэньняў, бо невядома, дзе ставіць чырвоны дыск.

Першыя дні абмену паказалі, што большая колькасьць вагонаў здаецца пунктам з невыкананым рамонтам.

Здана Заходняй чыг. 765 вагонаў, з якіх 427, паводле пратаколу, падлягаюць рамонту на суму 9.573 руб. 23 кап. і зусім забракавана 4 вагоны. Апрача гэтага, большая частка вагонаў з-пад дроў па некалькі раз пападалі ў пратакол з абодвух бакоў, але не рамонтуюцца.

Машыніст-ударнік тав. ЛЕШЧАНКА падаў заяву аб уступленьні ў партыю.

Такія выпадкі ні ў якім разе недапушчальны, яны павінны быць зьнішчаны.

Брыгада «Зьвязды»:
Якаўлеў, Міхайлаў і Васільеў.

Ні зьдельшчыны, ні гаспадарчага разрахунку

Першыя дні працы абменнага пункту на ст. Ворша выявілі рад недахопаў, якія тлумачацца дрэнным падрыхтоўкай да адкрыцьця пункту.

Не хапае запасных частак: шпілінтоў, цьвікоў, шурупаў 100 х 6 м-м, чак рэсорных, дошак для падлогі, абшывачных, сьцержняў гаек, рэсор 12-13 л., ціскоў плёмбіровачных і інш. Няма кладоўкі. У памяшканьні, дзе працуюць сьлесары, холадна, бо печ у неспраўнасьці.

Агенты абменнага пункту Заходняй чыгункі кватэрамі не забясьпечаны. Тэхнічныя агенты начуюць на сталах у памяшканьні пункту.

У выніку слабага кіраўніцтва партклектыву, мясцкому цягі і руху і несваячасовага правядзеньня падрыхтоўчай работы, партыйна-масавая і прафработа на пункце адсутнічае.

Не разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж зьменамі. Ня ўведзены чырвоныя і чорныя дошкі.

Пытаньнямі арганізацыі зьдельшчыны, ліквідацыі ўраўнілаўкі, пераходу на гаспадарчы разрахунак і інш. ніхто не займаецца.

Каб забясьпечыць бесьперабойную працу абменнага пункту, неабходна зараз-жа ліквідаваць пералічаныя недахопы.

Адначасова трэба стварыць трыкутнікі ў зьменах, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж зьменамі, завёўшы вучот выкананьня дагавораў і эфэктыўнасьці іх.

Брыгада «Зьвязды»

Не хапае кадраў, рамонтных матар'ялаў

ЖЛОБІН, 8. (БелТА). Да адкрыцьця абменных і рамонтных пунктаў па раёне не вялося ніякай падрыхтоўчай работы. Пункты не забясьпечаны кваліфікаванымі работнікамі.

На **Магілеўскім** пункце не хапае кала 30 работнікаў, з іх — аднаго агляднчыка вагонаў, 12 сьлесароў, 4 бляхароў і інш.

На **Асіпавіцкім** — не хапае аднаго агляднчыка, 6 сьлесароў, 3 сталяроў, аднаго бляхара. Такое-ж становішча і ў **Жлобіне.**

Вялікая патрэба ў запасных частках. Адсутнічаюць буферныя шклянкі і стрыжні, няма апаратных спружын, гаек, балтоў і рэсор. Пункты не забясьпечаны патрэбным начыньнем. Няма ў дастатковай колькасьці ліхтароў, дамкратаў-ціскоў, напільнікаў.

Агенты пунктаў не забясьпечаны памяшканьнем, тыя памяшканьні, якія ёсьць, не абсталяваны. Кузавы агляднчыкаў не агледжаны і ня прывезены ў парадак. На рамонтных калянах няма сьвятла, таму ўначы нельга рабіць рамонту.

Партыйныя прафсаюзныя і гаспадарчыя арганізацыі раёну і паасобных дэпо не зьвярнулі належнай увагі па забесьпячэньне бесьперабойнай работы абменных і рамонтных пунктаў, рабочыя масы ў выстарчальнай ступені не мабілізаваны на хутчэйшую арганізацыю рамонту вагонаў і поўную ліквідацыю абязьлічкі.

На ст. Крычаў загад т. Андрэева ня выконваецца

На ст. **Крычаў** загад тав. **Андрэева** прапрацоваць фармальна і да гэтага часу рабочымі і служачымі станцыі не ўсьвядомлен. У выніку гэтага, вагоны сыстэматычна прастойваюць. 31 кастрычніка нагружаны вагон бульбы прастаяў на станцыі двое сутак выключна з-за нядбайнасьці начальніка станцыі **Дакучаева.** 1 лістапада ён затрымаў зборны цягнік з тым, каб прычапіць гэты вагон бульбы. Але, прастаяўшы 20 лішніх мінут, цягнік пашоў, а вагон з бульбай ня быў прычэплен. Падобных фактаў на ст. Крычаў ёсьць шмат. Каму належыць, неабходна зацікавіцца гэтым пытаньнем і прымусіць адміністрацыю станцыі працаваць па-новаму, па-баявому.

УЛ. ЛІЛІН

Сыгналы з мяснога фронту

На сёньняшні дзень сыстэма беларускага сьвіннасьнага трэсту «Сьвінавод» ужо палічвае 85 сацыялістычных фабрык мяса. Паводле апошніх даных, агульнае пагалоўе сьвінасаўгасаў перавышае 70.800 сьвіней, у ліку якіх кала 28.500—сьвінаматак. Некаторыя з беларускіх мясных фабрык ужо дабіліся буйных дасягненьняў у барацьбе за вырашэньне мясной праблемы. Даволі адзначыць, што рад саўгасаў датэрмінова выканалі і перавыканалі заданьне па здачы таварнай прадукцыі. Саўгас «Зара Захаду» здаў 289 таварных сьвіней—144,5 проц. пляну, «Зарэчча»—493—142,5 проц., «Рымэ»—431—134,7 проц., «Замошша»—516—114,9 проц., «Нясята»—699—114,6 проц., «Гарадок»—112—110,9 проц., і г. д.

Аднак, у цэлым сыстэма беларускага «Сьвінаводу» адстае на важнейшых вучастках. Саўгасы ўкамплектаваны сьвінаматкамі на 74 проц., выходзячы з заданьня Наркамзему СССР пастаўціць 38.500 матак. Плян-жа, зацьверджаны ЦК КП(б)Б і СНК БССР—пастаўціць 50 тысяч матак,—выканан **толькі на 57 проц.** Асабліва вялікае адставаньне па фронце барацьбы за якасьць, за павышэньне таварнасьці. І абсалютна нездавальняюча прахо-дзіць па сыстэме здача таварнай прадукцыі.

Да 1-га студзеня 1932 г. сьвінасаўгасы павінны здаць дзяржаве 27.000 сьвіней, што складае, прыкладна, столькі-ж цэнтнэраў мяса, калі лічыць кожную штуку вагой у адзін цэнтнэр. На 20-га лістапада «Сьвінаводам» перадана Белмясу 14.909 шт. Заданьне па здачы таварнай прадукцыі выкапана толькі па 55 проц., а фактычна яшчэ менш, з прычыны дрэннага адкорму—зданыя сьвіньні важылі ў сярэднім не па адным цэнтнэры, а па 0,7—0,8 цнт.

Зварачае на сябе ўвагу і тое, што, у асноўным, у здачы таварных сьвіней прынялі ўдзел толькі 43 саўгасы з 65.

Выкананьне беларускімі мяснымі фабрыкамі сваіх абавязацельстваў перад дзяржавай да 1-га студзеня знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Аб гэтым гавораць лічбы. У сучасны момант на адкорме ў саўгасах знаходзіцца 6.329 шт., з іх—4.000 маладняка, вагой да 40 кілё. Гэта зноў сьведчыць аб тым, што значная частка прадукцыі будзе перадана Белмясу з вялікай недавагой. Калі нават адкінуць пытаньні якасьці, дык і ў колькасных адносінах сыстэма «Сьвінаводу» зможа выканаць заданьне толькі на 78 проц. (зда на 14.909 шт., плюс 6.329, пастаўленых на адкорм).

Адна з прычын такога становішча хаваецца ў значным недаўкамплектаваньні саўгасаў сьвінаматкамі. У гэтым, у першую чаргу, вінавата сама сыстэма «Сьвінаводу», якая не аддала належнай увагі камплектаваньню і ня здолела поўнасьцю захаваць тое, што ёю было атрымана. Далёка не бязгрэшна і Белмяса. Яно абавязана было даць саўгасам 25.000 сьвінаматак, а здало толькі 22.667, з якіх больш шасьць маладняк—парасяты і падсьвінкі.

Доля віны падае і на Наркамзем Беларусі, канкрэтна гаворачы, на яго вэтэрынарны сэктар. Як вядома, пастановай прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) ад 2-га жніўня мясцом было запрапанавана, у мэтах пасьляховай барацьбы з эпізоатыямі сярод сьвіней, устанавіць да 1-га верасьня кальцовыя прафілактычныя зоны. Да такіх зон павінны былі быць аднесены мясцовасьці, сапраўды паражоныя эпізоатыямі, для пасьляховай барацьбы з якімі ў прафілактычныя зоны часова забараняецца ўвоз (і вываз з іх) сьвіней.

НКЗ БССР выкоўвае гэту пастанову толькі 25-га кастрычніка, г. зн. з вялікім спазьненьнем. Уся БССР разьбіваецца на тры зоны.

Да першай адносяцца раёны найбольш паражоныя эпізоатыямі. У другую зону залічваюцца раёны часткова паражоныя. У трэцюю зону зусім непаражоныя.

Такое ўстанаўленьне кальцовых прафілактычных зон нельга прызнаць правільным. Па-першае, таму, што раёны былі аднесены Наркамземам Беларусі да адпаведных зон на падставе прыблізных і даволі грубых арыентовачных даных. Па-другое, **у пэўныя зоны ўключаліся не асобныя мясцовасьці, паражоныя,** або непаражоныя эпізоатыямі, **а цалкам раёны ў іх адміністрацыйных межах.** У рэзультаце рад раёнаў цалкам абвяшчаюцца паражонымі і ізалююцца зусім, у той час, як у кожным з такіх раёнаў ёсьць частка сельсаветаў зусім «благополучных», а ў некаторых непаражоных раёнах—яўна «неблагополучные» сельсаветы.

Хаця Наркамзем і дазваляе вывозіць забітых сьвіней з усіх зон, а таксама праводзіць камплектаваньне ўнутры зон за лік іх уласных рэсурсаў, аднак, яго пастанова зьявілася адным з фактараў, як затармазіў нармальны ход камплектаваньня, асабліва саўгаснага стада, і загатовак сьвіней.

На 25-га лістапада квартальны плян загатовак буйной рагатай жывёлы выканан па БССР на 69,1, а па сьвіньнях—толькі на 12,8 проц. Разрыў вялізарны. Гэта у пэўнай меры—рэзультат уключэньня цэлых раёнаў у іх адміністрацыйных межах у тыя ці іншыя зоны.

Недакладнасьць у разьмежаваньні зон дала новы «матыў» для апраўданьня апартуністычнай бязьдзейнасьці асобных работнікаў. Непасрэдную дапамогу ім аказвае рад вэтэрынарных работнікаў, якія па-бюракратычнаму вырашаюць той ці іншы выпадак. А на практыцы гэта прывяло да фактычнага спыненьня ўкамплектаваньня раду сьвінаводчых саўгасаў.

Прычыны адставаньня «Сьвінаводу» ў здачы таварнай прадукцыі ў значнай ступені, хаваюцца ў зрыве злучной кампаніі восеньню 1930 году і першага кварталу 1931 году. Вялізарны ўплыў зрабіў злачынна вялікі адыход стада, які па маладняку дасягае 29,5 проц., па парасятах—36,3 проц., па сьвінаматках—10,9 проц. Гэтыя лічбы—яркія паказальнікі дрэннага кармленьня і догляду стада незахаваньня зоавэтмінімуму ў большасьці сьвінаводчых саўгасаў.

Здача таварнай прадукцыі ні перад партыйнымі і прафэсыянальнымі арганізацыі саўгасаў, ні перад дырэкцыяй Сьвінаводу **не стала, як цэнтральная баявая задача—і ў гэтым прычына ўсіх прычын.**

Сыстэматычнай барацьбы за паляпшэньне якасных паказальнікаў, з стратамі у жывёлагадоўлі не вялося. Пытаньні арганізацыі ўзорнага выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай фактычна стаялі на заднім пляне. Гэтай справай, пачынаючы ад саўгасаў і канчаючы апаратам трэсту, цікавіліся менш усяго. Адсюль і яўна нездавальняючая работа па пастаноўцы сьвіней на адкорм. Трэст сыстэматычнага і апэрацыйнага кіраўніцтва правядзеньнем мерапрыемстваў, якія забясьпечылі-б сваячасовае выкананьне пляну здачы таварнай прадукцыі, не наладзіў.

Недаацэнка важнейшай задачы і адсутнасьць належнага кантролю з боку трэсту за ходам здачы саўгасамі таварнай прадукцыі спрыяла разбазараньню сьвіней у некаторых саўгасах.

Калі ў сыстэме Саюзцукару партыю і пралетарскую дзяржаву ашуквалі шляхам раздуваньня ўсемагчымых фондаў, дык у частцы сьвінасаўгасаў гэта рабілі, апіраючыся на эпізоатыі. Саўгас «Насовічы», нібы, у сувязі з эпізоатыяй зарэзаў 86 сьвіней, мяса пікуды ня здаў, а спажыў сам. У саўгасе «Некрашы» па працягу трох месяцаў было зьедзена 6 буйных сьвіней і 36 штук маладняка. Апрача таго, забіта 51 шт. «у сувязі з падазронасьцю на чуму», але ў актах няма патрэбнай адзнакі доктара аб неабходнасьці забою. Акты паказваліся толькі праз 5-10 дзён пасьля іх складаньня і доктар, зразумела, адмаўляўся завочна пацьвердзіць неабходнасьць прырэзкі. Тут мела месца яўнае **разбазарваньне.**

22-га ліпеня «Сьвінавод», з мэтай ліквідаваць якія-бы там ні было лазейкі, спэцыяльным загадам зусім забараняе саўгасам спажываньне сьвіней для сваіх патрэб. Каб задаволіць патрэбы ў мясе, прапануецца ставіць на адкорм выбракаваную буйную рагатую жывёлу. Мяса і іншыя прадукты адпускаць строга па нормах Наркамснабу, разасланых ва ўсе саўгасы.

Адначасова дырэктары 13 саўгасаў, за разбазарваньне таварнай прадукцыі і праяўленьне капіталістычных тэндэнцый, «Сьвінаводам» прыцягваюцца да крымінальнай адказнасьці, аб чым узьнімаецца хадайніцтва перад пракуратурай рэспублікі.

На пытаньнях выкананьня абавязацельстваў перад дзяржавай і неабходнасьці весьці жорсткую барацьбу з разбазараньнем таварнай прадукцыі, трэст завастрае ўвагу саўгасаў яшчэ ў двух загадах. 28 кастрычніка за слабыя тэмпы здачы зьнімаецца з работы дырэктар саўгасу «Беларусь» Жызнеўская, двум дырэктарам іншых саўгасаў выносіцца вымова.

Аднак, гэтым фактычна абмяжоўваецца дзейнасьць трэсту ў даным напрамку. **Штодзённай сыстэматычнай барацьбы са спажывецкімі тэндэнцыямі, з месьніцтвам не вялося.** Арганізацыйна-масавых мерапрыемстваў, якія зрабілі-бы ў корні немагчымым разбазарваньне таварнай прадукцыі, «Сьвінавод» ня прыняў. Праверкі выкананьня дырэктыў аб забароне спажываньня сьвіней для ўнутрысаўгасных патрэб ня было наладжана.

Тут варта спыніцца і на палітычнай недаацэнцы барацьбы з разбазараньнем таварнай прадукцыі ў саўгасах, праяўленай радам судовых органаў. Большасьць спраў, узьнятых «Сьвінаводам» у ліпені, яшчэ не разглядквалася. 6-га кастрычніка трэст зьвярнуўся да пракурора рэспублікі з просьбай зрабіць уплыў на раённых пракураў і прапанаваць ім паскорыць слуханьне гэтых спраў у паказальным парадку. Гэта просьба засталася пакуль без рэальных вынікаў.

Неабходна ўкараніць у сьвядомасьць кожнага рабочага саўгасу, кожнага работніка трэсту, што выкананьне абавязацельстваў перад дзяржавай зьяўляецца цэнтральнай задачай сацыялістычных фабрык мяса. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны ў гэтым напрамку разгарнуць шырокую масавую работу, выкрываючы буржуазную сутсутнасьць рвацкіх спажывецкіх тэндэнцый, мабілізуючы калектывы саўгасаў на рашучы адпор кулаку і яго агентуры.

Наркамзему БССР варта ў магчыма кароткі тэрмін перагледзець сваю разьбіўку рэспублікі на прафілактычныя зоны, адмовіўшыся ад прынцыпу адпясеньня да іх цэлых раёнаў у адміністрацыйных межах. У «неблагополучные» зоны трэба ўключаць не раёны, а мясцовасьці, сапраўды паражоныя эпізоатыямі.

Выйдзем у першыя калёны змагароў за фінплян!

Да ўсіх рабочых, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, грамадзкіх арганізацый і фінансавых работнікаў БССР

Пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі пралетарыят, калгасьніці і ўсё працоўнае насельніцтва БССР паўсходзяць да апошняга году пяцігодкі з вялізарнымі посьпехамі. Пашыраецца ганаровы сьпіс прадпрыемстваў, якія датэрмінова выканалі пяцігадовы плян. Шпаркімі тэмпамі ідзе сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі. Усё вышэй уздымаецца энтузіязм працоўных, якія ня толькі сваёй творчай работай, але і ўласнымі грашовымі накапленьнямі прымаюць удзел у пабудове сацыялізму. Толькі праз масавыя дзяржаўныя пазыкі і касы ашчаднасьці працоўнымі БССР укладзена ў сацыялістычнае будаўніцтва больш 100 млн. руб.

Рост сацыялістычнай гаспадаркі, рост дабрабыту працоўных ствараюць усе прадпасылкі для далейшых посьпехаў у гэтай галіне, для поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну мабілізацыі сродкаў.

Толькі слабасьць арганізацыйна-масавай работы, невыстарчальна шырокае ўцягненьне мільённых мас працоўных, няўменьне паасобных зьвеньняў фінансавага апарату «працаваць і кіраваць па-новаму»—зьяўляюцца прычынамі недавыкананьня пляну мабілізацыі сродкаў па радзе раёнаў, у выніку чаго БССР у гэтай галіне адстае ад перадавых рэспублік і вобласьцей СССР.

Усебеларускі зьлёт ударнікаў фінансавага фронту, які сабраўся на пароге 4-га—апошняга году пяцігодкі, заклікае рабочых, калгасьнікаў, бядняцка-серадняцкія масы вёскі, настаўніцтва—уліцца ў рады актывістаў фінансавай работы, стварыць магутную армію барацьбітоў за выкананьне фінансавага пляну і яго важнейшай часткі—мабілізацыю сродкаў.

ТАВАРЫШЫ РАБОЧЫЯ ФАБРЫК І ЗАВОДАЎ БССР! На аснове строгага ажыцьцяўленьня прынцыпаў гаспадарчага разрахунку дабівайцеся поўнага выкананьня фінпляну нашых прадпрыемстваў. На справе ажыцьцяўляйце лёзунг: «Ніводнага працоўнага без аблігацыі дзяржаўных пазык, без ашчаднай кніжкі», трымайце ўсе часова вольныя сродкі ў ашчадкасах.

КАЛГАСЬНІКІ БССР! Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, будаўніцтва МТС, машынізацыя, падрыхтоўка калгасных кадраў,—патрабуюць шырокай мабілізацыі сродкаў як калгасаў, так і асабліва калгасьнікаў. Станавецеся ў авангард вёскі па выкананьні фінпляну. Безадкладна ліквідуйце сваю запазычанасьць перад пралетарскай дзяржавай, будзьце застрэльшчыкамі баявых тэмпаў па выкананьні абавязковых плацяжоў, па рэалізацыі дзяржаўных пазык, ашчадным ашчаднасьцям, ашчадным ашчаднасьці. Змагайцеся за своячасовае складаньне і строгае выкананьне фінпляну вашых калгасаў.

ГРАМАДЗКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ! Мабілізуйце тысячы новых, адданых справе сацыялістычнага будаўніцтва ўдарнікаў фінансавай работы. Узмацняйце камісіі садзейнасьці лепшымі ўдарнікамі і сачэце за іх работай.

КАМСАМОЛ — ШЭФ АШЧАДКАСЬ! Ты адказваеш за выкананьне пляну на гэтым вучастку. Лепшымі камсамольскімі сіламі ўзмацняй апарат ашчадкас. Баявымі мэтадамі камсамольскай работы надай справе мабілізацыі сродкаў неабходныя тэмпы, забясьпеч ліквідацыю адставаньня ашчадкас.

ФІНАНСАВЫЯ РАБОТНІКІ! Вы паставлены на адказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва. Фінансавы плян—гэта ваша вытворчае заданьне і за яго выкананьне вы абавязаны змагацца з тэй-жа настойлівасьцю і такімі-ж мэтадамі і формамі работы, якімі рабочыя сацыялістычных фабрык і заводаў змагаюцца за выкананьне вытворчых пляноў сваіх прадпрыемстваў.

Задача поўнага выкананьня і перавыкананьня пляну IV-га кварталу—баявая і важнейшая зьдача.

ПЕРАДАВЫЯ ГАРАДЫ І РАЁНЫ! Па-бальшавіцку змагайцеся за перавыкананьне пляну IV-га кварталу, не вобласьлаблячы ўзятых тэмпаў.

Рабочыя, калгасьнікі, бядняцка-серадняцкія масы сялянства, грамадзкія арганізацыі і фінработнікі БЯГОМЛЬСКАГА, ЛОЕЎСКАГА, БЯРЭЗІНСКАГА, ЧЫРВОНАПОЛЬСКАГА, УВАРАВІЦКАГА, РАСОНСКАГА, АСЬВЕЙСКАГА, СУРАСКАГА, КАРМЯНСКАГА І ЧЭРВЕНЬСКАГА РАЁНАЎ! Ваша недапушчальнае адставаньне ў выкананьні пляну IV-га кварталу зьніжае агульныя тэмпы нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Вы нясеце адказнасьць за адставаньне БССР ад перадавых рэспублік і вобласьцей СССР. Мабілізуйце грамадзкасьць вашых раёнаў і ўдарнымі тэмпамі дабівайцеся посьпеху.

Праз шырокую масавую работу, датэрміновым выкананьнем пляну IV-га кварталу забясьпечым сыстэматычнае, з дакады ў дакаду, выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў і бесьперабойнае фінансаваньне вялізарнай праграмы сацыялістычнага будаўніцтва ў IV-м апошнім годзе пяцігодкі.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, уперад да новых перамог на фінансавым фронце—важнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.

ПЕРШЫ ЎСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ.

Ударны 3-хдзеньнік мабілізацыі сродкаў

Прапанова калектыву рабочых заводу імя Варашылава

КАЛЕКТЫЎ РАБОЧЫХ **ЗАВОДУ ІМЯ ВАРАШЫЛАВА,** У СУВЯЗІ З УСЕБЕЛАРУСКІМ ЗЬЛЁТАМ УДАРНІКАЎ ФІНАНСАВАГА ФРОНТУ, ЗЬВЯРНУЎСЯ СА СПЭЦЫЯЛЬНАЙ АДОЗВАЙ ДА РАБОЧЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ АДСТАЮЦЬ У ВЫКАНАНЬНІ ФІНПЛЯНУ.

ВАРАШЫЛАЎЦЫ ВЫКЛІКАЮЦЬ АДСТАЮЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ЛІКВІДАВАЦЬ НА ПРАЦЯГУ БЛІЖЭЙШАГА ЧАСУ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ПА ПАЗЫЦЫ, ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ КАНТРОЛЬНУЮ ЛІЧБУ ПА ЎКЛАДАХ У АШЧАДКАСЫ, ДАБІЦЦА 100-ПРОЦАНТНАГА АХОПУ РАБОЧЫХ КАЛЕКТЫЎНЫМ СТРАХАВАНЬНЕМ.

СА СВАЙГО БОКУ, ВАРАШЫЛАЎЦЫ БЯРУЦЬ НА СЯБЕ АБАВЯЗАЦЬ ДА 20 СЬНЕЖНЯ АХАПІЦЬ ПАЗЫКАЙ УСІХ НОВАПРЫБЫЎШЫХ РАБОЧЫХ. НА ПРАЦЯГУ ПЕРШАГА КВАРТАЛУ 1932 ГОДУ ВАРАШЫЛАЎЦЫ АБАВЯЗУЮЦЦА ПОЎНАСЬЦЮ САБРАЦЬ УСЕ НЯДОІМКІ ПА ПАЯНАКАПЛЕНЬНІ У ЗРК — КАЛ. 36.000 РУБ.

РАБОЧЫЯ ПРАПАНУЮЦЬ, У АДЗІНАКУ ЗЬЛЁТУ, АРГАНІЗАВАЦЬ 3-ХДЗЕНЬНІК УДАРНАЙ РАБОТЫ ПА ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНУ МАБІЛІЗАЦЫ СРОДКАЎ НА МЕНСКІХ ПРАДПРЫЕМСТВАХ. КАЛЕКТЫЎ РАБОЧЫХ ВЫЛУЧАЕ 30 ЛЕПШЫХ ФІНАРМЕЙЦАЎ, ЯКІЯ, СУМЕСНА З УДЗЕЛЬНІКАМІ ЗЬЛЁТУ УДАРНІКАЎ, БУДУЦЬ НАКІРАВАНЫ НА АДСТАЮЧЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ ДЛЯ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ АДПАВЕДНАЙ МАСАВАЙ РАБОТЫ.

Узмацніць мабілізацыю сродкаў па спажывецкай сыстэме

ЦК КП(б)Б за подпісам тав. Шаранговіча і СНК БССР за подпісам тав. Галадзеда паслалі ўсім райкомам КП(б)Б і РВК наступную тэлеграму:

«Прапануем узяць пад асобы нагляд і штодзённае кіраўніцтва мабілізацыю сродкаў насельніцтва па спажыўкаапэрацыі, з мэтай поўнага выкананьня гадавога пляну, у сувязі з пераводам каапэрацыі на работу ўласнымі сродкамі»

І. С. Адам

Важнейшыя задачы калдагаворнай кампаніі

БССР падыходзіць да кампаніі пераключэньня калдагавароў на 1932 г. з вялізарнымі дасягненьнямі ў сацыялістычным будаўніцтве. 10 месяцаў бягучага году ў параўнаньні з 10 месяцамі мінулага году, далі прырост прадукцыі па прамысловасьці БССР на 40 проц. У строй уступілі новыя буйныя фабрыкі (шэйная «Сьцяг індустрыялізацыі», трыкатажная, «Камунарка» і інш.). Рад галін прамысловасьці датэрмінова выканаў пяцігодку (шэйная прамысловасьць, «Палесдрук»). Гарбарня «Бальшавік» выканала прамфінплян трэцяга рашаючага на 27 дзён раней тэрміну.

Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі і яе ленінскага ЦК, дзякуючы няўхільнаму росту вытворчай і палітычнай актыўнасьці рабочай клясы і згуртаваньня яе вакол генэральнай лініі партыі.

Рост вытворчага энтузіязму рабочых мас, далейшае разьвіцьцё новых вышэйшых форм сацспаборніцтва і ўдарніцтва (сустрэчны прамфінплян, гаспадарча-разрахунковыя брыгады) поўнасьцю забясьпечваюць выкананьне вызначаных заданьняў.

Аднак, вялізарныя магчымасьці для выкананьня прамфінпляну не скарыстаны асобнымі галінамі прамысловасьці. Прамфінплян па радзе прадпрыемстваў выканан нездавальняюча. Асабліва дрэнна стаіць справа з выкананьнем якасных паказальнікаў. Рост прадукцыйнасьці працы значна адстае ад плянавых заданьняў (за тры кварталы — 14,2 проц. замест 33 проц.); а рост зарплаты перавысіў плянавыя намечаныя замест 106 — 108,4 проц.

Асноўная прычына нездавальняючых вынікаў у выкананьні прамфінпляну — гэта зусім невыстарчальная рэалізацыя шасьці умоў тав. Сталіна ў рабоце прамысловасьці. Аб гэтым з усёй відавочнасьцю сьведчаць даныя праверкі ажыцьцяўленьня калдагавору бягучага году.

Калдагавор, рэалізацыя яго двухбаковых абавязацельстваў — зьяўляецца адным з магутных фактараў ажыцьцяўленьня задач, пастаўленых тав. Сталіным, магутным вагаром у барацьбе за прамфінплян.

Між тым, на радзе прадпрыемстваў мы маем парушэньне многіх пунктаў калдагавору. На фабрыцы «Дзьвіна», на цагельных заданьні па прамфінпляне нерэгулярна даводзіліся да рабочых. Цагельні Менбуду былі забясьпечаны рабочай сілай толькі на 40 проц., а арганізаваны набор новых рабочых не праводзіўся: дагавары з калгасамі ня былі заключаны. Рабочыя кепска абслугоўваліся, таму з завербаваных па аднэй з цагелень 200 рабочых засталося толькі 60.

На радзе прадпрыемстваў (фабрыка імя Клары Цэткін, дэпо ст. Менск і інш.) варштаты не прымацаваны да пэўных рабочых, не арганізован пашэраджальны рамонт, адсюль вялікія прастоі і частыя паломкі абсталяваньня.

На радзе прадпрыемстваў пануе яшчэ дробна-буржуазная ўраўнілаўка ў зарплаце. Улік зьдзельшчыны часта праводзіцца не па фактычна прапрацаваным зьдзельным часе, а па колькасьці рабочых, пераведзеных фармальна на зьдзельшчыну. Наогул ахоп зьдзельшчынай невыстарчальны.

Зусім прымітыўна падышло да перабудовы сыстэмы зарплаты кіраўніцтва махорачнай фабрыкі ў Віцебску, аўтаматычна павялічыўшы зарплату пачасовым рабочым на 30-50 проц., і на гэтым справа скончылася. Возчыкаў як быццам перавялі на зьдзельшчыну, але ўстанавілі нормы і расцэнкі «са столі». Такім чынам заработная плата іх узьнялася з 57 р. да 160-170 р.

Такія-ж сказэньні дапушчаны на іншых прадпрыемствах. Ёсьць выпадкі недаацэнкі вядучых прафэсій. Вядучая група сетачнікаў (7 разрад) на папяровых машынах (фабрыка «Герой працы» зарабляе 120-130 руб., а іншыя групы (6-7 разраду) па 260 р. Паасобныя сьлесары па рамонце паравозаў на гэтай-жа фабрыцы па прычыне дрэннай пастаноўкі тэхнічнага нармаваньня часамі зарабляюць па 700-800 р. у месяц.

Сярэдняя заработная плата рабочых 8-га разраду па заводах мэтталяб'яднаньня на 1 руб. 22 кап. менш заработку рабочых 7-га разраду (8 р. 17 кап. і 9 р. 39 кап.). Сьлесар 3-га разраду па рэчыцкай запалкавай фабрыцы працуе пачасова, заработак яго складае 3 р. 93 кап., а стругаль 6-га разраду працуе зьдзельна і зарабляе 3 руб. 91 кап. Такіх прыкладаў можна прывесьці шмат.

Ня зьнішчаны яшчэ прастоі па прычыне тэхнічных непаладак — несваячасовай падачы поўфабрыкатаў і інш. (фабрыка імя Клары Цэткін).

Наглядаецца вялікая колькасьць прагулаў па найважлівых прычынах: на шэйнай фабрыцы імя Валадарскага ў Магілеве — 2,55 проц., на акулярнай фабрыцы ў Віцебску — 2,25 проц. На фабрыцы «Дзьвіна» колькасьць нявыхадаў на работу па паважлівых прычынах складала ў студзені 1.119 чалавека-дзён, а ў жніўні — 2.058.

На многіх прадпрыемствах маюць месца няўважлівыя, ігнаруючыя адносіны да паляпшэньня сацыяльна-бытавых умоў рабочых. На «Возуші» было асыгнавана на жыльлёвае будаўніцтва 20.000 руб., выдаткавана — **нуль.** На ахову працы выдаткавана 317 руб. з 32.000 руб. Узьнікае думка — можа на «Возуші» ўсё так добра абстаіць, што няма чаго сыпяцца з культурна-бытавымі мерапрыемствамі? Аднак, факты паказваюць зусім адваротнае. У здымальным і паковачным аддзяленьнях падлога зруйнавана, тырчаць абломкі каменных пліт, у выніку — частыя траўмы. Вэнтыляцыя ў трусках папсавана. Сталоўка знаходзіцца ў антысанітарным становішчы, зьяўляецца бясспрытульным вучасткам, якому заводзкія арганізацыі не аддаюць ніякай увагі. У інтэрнаце — бруд, антысанітарыя. Да гэтага прывяло нежаданьне заводзкіх арганізацый рэалізаваць абавязацельствы калдагавору.

На лесазаводзе «Калектыўная праца» няма кіпяцільнікаў для піцьцёвай вады, не хапае нават сырой вады.

На акулярнай фабрыцы, на фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» (Віцебск) ёсьць выпадкі несваячасовай выплаты зарплаты. На фабрыцы «Сьцяг індустрыялізацыі» з-за дрэннай тэхнікі выдачы зарплаты былі выпадкі, калі рабочыя прастойвалі па некалькі гадзін у чарзе за атрыманьнем грошай.

Значна адстае вучастак барацьбы за якасныя паказальнікі, за зьніжэньне сабекошту, за якасьць прадукцыі. Становішча з якасьцю трэба прызнаць яўна нездавальняючым (асабліва па шэйнай, абутковай прамысловасьці, па акулярнай фабрыцы).

Усе гэтыя факты паказваюць, што некаторыя заводзкія арганізацыі яўна недаацэньваюць значэньня калдагавароў у барацьбе за прамфінплян. Вось чаму падыходзячая калдагаворная кампанія, якая павінна забясьпечыць пасьпяховае выкананьне прамфінпляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі, непарыўна зьвязана з найбольш поўнай рэалізацыяй узаемных абавязацельстваў па існуючых калдагаварох.

Нарада ЦП саюзаў, гаспадарчых аб'яднаньняў і Наркампрацы, якая адбылася **4-га сьнежня,** зусім правільна адзначыла неабходнасьць да пачатку новай калдагаворнай кампаніі забясьпечыць ажыцьцяўленьне абавязацельстваў, узятых на сябе прафсаюзамі, адміністрацыяй і рабочымі па калдагаварох 1931 г.

УсеЦСПС і ВСНГ СССР у сваёй пастанове катэгарычна паказалі, што перадзімовер'ем да падыходзячай калдагаворнай кампаніі павінна быць масавая праверка выкананьня калдагавору бягучага году, якую трэба правесьці з 5-га па 20-га сьнежня, увязваючы ле з усёй падрыхтоўчай працай да перазаключэньня калдагавароў 1932 г.

Праверка павінна высьветліць, як рэалізаваны абавязацельствы па дагаварох з боку прафсаюзаў, гаспадарнікаў і рабочых, павінна

АКУПАНТЫ ПЕРАТВАРАЮЦЬ МАНЧЖУРЫЮ У СВАЮ КАЛЁНІЮ

Паўторны ўльтыматум

ТОКІЁ. (ТАСС) Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе з Мукдэну: «У сувязі з пастановай рады Ліг Нацый па пытаньні аб пэйтралізацыі раёну Цзіньчжоу каманданьне кватурнскай арміі яшчэ раз прапануе ўраду Чжан Сюэляна эвакуявацца з Цзіньчжоу. У процілеглым выпадку будуць прыняты адпаведныя меры».

Ва ўльтыматуме, які перадаецца ўраду Чжан Сюэ-ляна ўказваецца **дакладная дата** аб эвакуацыі як ураду, так і войск з Цзіньчжоу. Японскія газэты паведамляюць аб пачатым «прасоўваньні 20.000 войск Чжан Сюэ-ляна ў напрамку да Мукдэну. Прасоўваньне адбываецца наперакор перасьцярозе, зробленай Хантэйё. Улічваючы гэта прасоўваньне, а таксама ўзрастаючую актыўнасьць «бандыцкіх» груп, ваенныя ўлады, па словах газэт «канчаткова паранцылі падтрымаць парадак у Манчжурыі выключна пры дапамозе японскіх войск. Кітайскія салдаты будуць поўнасьцю выгнаны з Манчжурыі».

Пляны захватчыкаў

„Манчурыя павінна стаць базай індустрыялізацыі Японіі...“

ТОКІЁ, 8. (ТАСС) Дырэктар Паўднёва-Манчжурскай чыгункі Саіта ў артыкуле, зьмешчаным у «Асахі», заяўляе:

«Манчжурыя павінна стаць базай індустрыялізацыі Японіі. Сырэц для асноўных галін прамысловасьці павінен знаходзіцца цалкам у японскіх руках. Сучасны эканамічны стан пабудзе, каб тэкстыльная Японія ператварылася ў мэталічную, мэханічную і хімічную. Вялікую ролю ў гэтых адносінах грае нафта, якая ёсьць у Манчжурыі ў выглядзе слянцоў. У наяўнасьці таксама патрэбныя для індустрыялізацыі вугаль, жалезная руда і г. д.

Чарговым крокам у разьвіцьці сырцовых рэсурсаў павінна быць стварэньне чыгуначнай сеткі для перавозкі сырцу, а таксама ўстанаўленьне адпаведнай сыстэмы сувязі з Японіяй». Саіта катэгарычна абвяргае думку разьвіцьця сырцовых багацьцяў у Манчжурыі зьмешанымі кітайска-японскімі таварыствамі. У мэтах забесьпячэньня для Японіі сырцовай базы, неабходна рэарганізаваць сыстэму кайчжурскага транспарту і прыняць увесь у стварэньні фінансавай сыстэмы ў Манчжурыі і ўнутраной Манголіі; потым выключыць магчымасьць умяшаньня кітайскага ўраду ў экспарт сырцу з Манчжурыі.

Аднак, з прычыны таго, што ёсьць межы разьвіцьця Паўднёвай Манчжурыі, Японія павінна прасунуцца ў Паўночную Манчжурыю. Зараз адзінка выя шляхі, якія злучаюць Японію з Паўночнай Манчжурыяй,—КУЧ, а так сама Таонань-Ананьці чыгунка. Але паколькі КУЧ цяжка выкарыстаць, бо яна знаходзіцца ў руках СССР, а Таонань-Ананьці чыгунка мала, дык неабходны новыя выхады да мора. У першую чаргу трэба скончыць Гірынь-Хайрэнскую чыгунку. Пункт Хайрэн па-за небясьпекай, нават у выпадку вайны, таму яго трэба злучыць з новымі шляхамі Паўночнай Манчжурыі. Японія павінна мець новыя шляхі для сувязі з Паўночнай Манчжурыяй, без выкарыстаньня КУЧ». Саіта рэкамэндуе пабудаваць чыгункі: Чанчунь-Далай, Гірынь-Учан і Янцзі-Хайлін, сьцьвярджаючы, што ёсьць згоды, заключаныя Чжан Цзо-лінам аб пабудове гэтых дарог.

900.000 чалавек—напярэдадні галоднай сьмерці

ТОКІЁ, 8. (ТАСС) На прэфэктурнай нарадзе Асмары, (прэфэктура на поўначы Японіі), якая адбылася ўчора ў Токіё, паведамляліся падрабязнасьці голаду ў гэтай прэфэктуры.

900.000 ЧАЛАВЕК ЗНАХОДЗІЦЦА НАПЯРЭДАДНІ ГАЛОДНАЙ СЬМЕРЦІ. Плацяжы падаткаў і даўгоў спынены. З прычыны адсутнасьці сродкаў, насельніцтва ня плаціць за электрычнасьць і за іншыя камунальныя паслугі.

Многія галадаюць і не наведваюць заняткаў, у рэзультаце некалькі школ ужо закрыты. У вёсцы Сарубамура медыцынская камісія ў 200 сем'ях знайшла 250 цяжка хворых. У вёсцы Товадамура 700 сем'яў маюць цяжка хворых. Прыехаўшыя чыноўнікі—дэпутаты прэфэктурнага сходу—патрабавалі асыгнаваньня 20.000.000 іен для аказаньня дапамогі, указваючы, што ў процілеглым выпадку адбудзецца закрыцьцё ўсіх адміністрацыйных і школьных устаноў, бо ў прэфэктуры спынілася паступленьне ўсякіх плацяжоў. Банкі, якія ёсьць у прэфэктуры, банкрутуюць.

Новы надзвычайны дэкрэт у Германіі

Чарговы „надзвычайны“...

БЭРЛІН, 8. (ТАСС). Германскі ўрад скопчыў распрацоўку новага надзвычайнага дэкрэту, які будзе падпісан прэзыдэнтам Гіндэнбургам і апублікаван сёньня ночу або заўтра раніцай. Новы надзвычайны дэкрэт перавышае ўсе ранейшыя дыктатарскія мерапрыемствы ў галіне зьніжэньня жыцьцёвага ўзроўню рабочай клясы і працоўных, а таксама ў галіне абмежаваньня палітычных правоў рабочага руху.

***

БЭРЛІН, 8. (ТАСС). Учора ў Мюнхене паліцыя апячатала друкарню камуністычнай газэты «Нэйе цэйтунг» за надрукаваньне адозвы ЦК КПГ да сацыял-дэмакратычных рабочых і членаў саюзу рэспубліканскага сьцягу.

Дзьлітаснае наступленьне на зарплату рабочых і служачых

БЭРЛІН, 9. Агенцтва Вольф паведамляе: «Учора ўвечары апублікованы новы надзвычайны дэкрэт. Дэкрэт прадугледжвае зьніжэньне ўсіх так званых вязаных цэн, г. зн. цэн, устаноўленых згодамі розных прадпрыемніцкіх арганізацый, на 10 проц. Невыкананьне гэтага пункту цягне за сабою аўтаматычнае скасаваньне існуючых згод у галіне цэн. Апрача таго зьніжаюцца на 10 проц. цэны па вугаль, калі і азот.

Назначаны ўрадам камісар па зьніжэньні цэн атрымлівае самыя шырокія паўнамоцтвы, аж да права закрываць канцэрны прадпрыемствы.

Далей дэкрэт устанаўляе зьніжэньне процанту па ўсіх дзяржаўных, муніцыпальных і прыватных даўгавых абавязацельствах на 25 проц. Апрача таго, дзяржаўны камісар па нагляду за банкамі правядзе далейшае зьніжэньне процанту па запазычанасьці банкам, калі гэта будзе патрэбна, нават шляхам простага загаду. Пазыковы процант будзе зьніжан да ўзроўню вэксальнай вучотнай стаўкі, зараз пазыковы процант зьніжаецца на адзін процант. Дэкрэт прадугледжвае далей паступовую ліквідацыю падатку на кватэрную плату, які будзе канчаткова скасаваны да 1 красавіка 1940 г. У адпаведнасьці з гэтым паступова будзе зьніжана кватэрная плата. Тарыфы на перавозку грузаў па чыгунках зьніжаюцца для раду тавараў на 12-26 проц., прычым агульная сума, на якую будуць зьніжаны гэтыя тарыфы, складае 300 млн. марак.

З моманту ўступленьня ў сілу новага надзвычайнага дэкрэту скасоўваюцца ўсе існуючыя тарыфныя згоды і ўсе стаўкі зарплаты рабочых і служачых **ЗЬНІЖАЮЦЦА** да ўзроўню, на якім яны знаходзіліся 10 студзеня 1927 году. **ЗАРПЛАТА ДЗЯРЖАЎНЫХ МУНІЦЫПАЛЬНЫХ СЛУЖАЧЫХ ЗНІЖАЕЦЦА НА 9 ПРОЦ., А ЗАРПЛАТА РАБОЧЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ І МУНІЦЫПАЛЬНЫХ ПРАДПРЫЕМСТВАЎ — НА 10 ПРОЦ.**

Для барацьбы супроць уцечкі капіталу заграніцу надзвычайны дэкрэт прадугледжвае ўвядзеньне спэцыяльнага падатку, якім будуць абкладацца ўсе, хто ў пэрыяд паміж 31 сакавіка 1931 году і 31 сакавіка 1933 году вывезе заграніцу больш, чым 200 тыс. марак. Падатак гэты будзе складаць 25 проц. вывезенай сумы. За ўтойваньне маемасьці ад абкладаньня ўнутры Германіі вінаватыя будуць неадкладна арыштоўвацца і карацца турэмным зьняволеньнем.

Для забесьпячэньня ўнутранога, міру, ў краіне надзвычайны дэкрэт забараняе насіць формы членам усіх існуючых у Германіі арганізацый. Забаронена таксама насіць якія-б там ні было значкі членам палітычных арганізацый. Зьнявага ўрадавых дзеячоў будзе карацца турэмным зьняволеньнем на тэрмін ня ніжэй трох месяцаў. Нарэшце, надзвычайны дэкрэт **ЗАБАРАНЯЕ** на час да 3 студзеня 1932 году **УСЯКІЯ СХОДЫ І ДЭМАНСТРАЦЫІ** «пад адкрытым небам» з мэтай забясьпечыць палітычны мір на каляды».

Рэйхсканцлер Брунінг і міністар фінансаў Дытрых прынялі прадстаўнікоў друку і далі ім тлумачэньні з повану пазасобных пунктаў новага надзвычайнага дэкрэту. Дытрых указаў, што ранейшае значэньне для Германіі мае пытаньне аб пагашэньні прыватнай і германскай заграніччнай запазычанасьці. Дытрых падкрэсьліў, што гэта магчыма толькі шляхам разьвіцьця германскага экспарту. Аднак, другія дзяржавы ўсё больш перашкаджаюць разьвіцьцю германскага экспарту. Адмаўленьне ад куплі германскіх тавараў роўназначнага адмаўленьню Германіі ад выплаты даўгоў, што выклікана аднак, зусім не адступасьцю ў Германіі жаданьня пагасіць сваю запазычанасьць. (ТАСС).

НЯУХІЛЬНЫ РОСТ КПГ

У кампартыю ўступілі 18180 новых членаў

БЭРЛІН, 8. (ТАСС). Ня гледзячы на ўзмоцнены тэрор супроць рэвалюцыйнага рабочага руху, КПГ і масавыя рэвалюцыйныя арганізацыі бесьперапынна растуць. У рэзультаце кампаніі па вярбоўцы 100.000 новых членаў у кампартыю ўжо ўступіла 18.180 чалавек.

Ліга „манэўруе...“

ПАРЫЖ, 8. (ТАСС). Паводле афіцыёзных вестак, рэдакцыйная камісія рады Лігі нацый даручана выпрацаваць контр-праект па пытаньні аб пэйтральнай зоне ў адказ на прапанаваны Іосізавай японскі праект, які прызнан нібы найпрыймальным. (Праект у асноўным патрабуе ачышчэньня кітайскімі войскамі Цзіньчжоу і адводу іх за кітайскую сьцяну).

На справе-ж большасьць членаў рады схіляецца да таго, каб скласьці з сябе ў далейшым усе клопаты і адказнасьць па гэтым пытаньні, абмежаваўшыся выяўленьнем «упэўненасьці ў тым, што ў далейшым бакі будуць захоўваць фактычнае становішча, якое зараз устанавілася, і ўстрымаюцца ад варожых дзеяньняў».

***

ПАРЫЖ, 8. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Гавас, кітайскі дэлегат Шы перадаў радзе Лігі нацый заяву нанкінскага ўраду. У гэтай заяве гаворыцца, што генэрал Ма зьвярнуўся да нанкінскага ўраду з просьбай афіцыяльна абвергнуць весткі аб тым, што ён мае намер атакаваць Цыцыкар.

Тэрміновае ўстанаўленьне ваенна-паветранай лініі ў Манчжурыі

БЭЙПІН, 9. Як паведамляюць з Харбіну, сёньня ў Харбіне распачаты тэрміновыя работы па пабудове часовага аэрадрому ў мэтах устанаўленьня ваеннай паветранай лініі ў Манчжурыі. У некаторых колах пабудову аэрадрому разглядаюць як меру, якая падрыхтоўвае стварэньне японскай паветранай ваеннай базы ў Манчжурыі. (ТАСС).

***

ТОКІЁ, 9. Паводле вестак Сімбун Рэнга, у Харбіне створана зьмешаная япона-кітайская аэракампанія для абслугоўваньня лініі Харбін-Мукдэн і Харбін-Цыцыкар, а потым будзе абслугоўваньня лініі Харбін—Мукдэн і Хойхо. (ТАСС).

***

ПАРЫЖ, 8. Японская дэлегацыя інфармуе раду Лігі нацый аб канцэнтрацыі кітайскіх войск у Цзіньчжоу аб «пагрозе нападу бандытаў» на японскія войскі і г. д. Кітайская дэлегацыя, са свайго боку, паведамляе аб падрыхтоўцы японскай акупацыйнай арміяй нападу на Цзіньчжоу. (ТАСС).

Японская сялянская арганізацыя пратэстуе супроць акупацыі Манчжурыі

БЭРЛІН, 8. Паводле атрыманых у Бэрліне вестак, у правінцыі Тояма (Японія) сялянская арганізацыя правяла сялянскі зьезд, на якім было прынята патрабаваньне аб неадкладным адкліканьні японскіх войск з Манчжурыі. У патрабаваньні гаворыцца, што салдаты, якія вярнуліся з Манчжурыі, «павінны накіраваць зброю супроць сваіх ворагаў». (ТАСС).

Зарплата ангельскіх докераў скарачаецца на 5.000.000

ЛЕНДАН, 8. (ТАСС). Уссангельская канфэрэнцыя кіруючых дзеячоў трэдюніёна транспартных рабочых пастанавіла большасьцю 58 супроць 11 галасоў згадзіцца з новай тарыфнай умовай для докераў. Паводле новай умовы зарплата скарачаецца на 5 млн. у тыдзень. Згода датычыць 200 тысяч докераў.

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА КАУНПОРСКІХ РАБОЧЫХ

ЛЕНДАН, 8. (ТАСС). Паводле тэлеграфнага паведамленьня з Бамбею ў Каўнпоры (буйнейшы прамысловы цэнтр у Злучаных правінцыях Індыі) абвешчана ўсеагульная забастоўка. Бастуе 45.000 рабочых. Ва многіх мясцох у фабрычным раёне гораду разьвіваюцца чырвоныя сьцягі. Па вуліцах гораду маршыруюць войскі. Мясцовыя ўлады выдалі загад, які забараняе ўсякія сходы.

„Галодны паход“ беспрацоўных ПАЗШ

Масавы мітынг у Вашынгтоне

ВАШЫНГТОН, 8. Удзельнікі «галоднага паходу» накіраваліся назад, пяючы «Інтэрнацыянал». Напярэдадні ўвечары адбыўся шматлікі мітынг, на якім апрача ўдзельнікаў паходу прысутнічала некалькі тысяч мясцовых рабочых. Выступаўшыя прамоўцы рэзка ганьбілі Гувэра і кангрэс, якія адмовіліся прыняць дэлегацыю беспрацоўных. На сходзе быў таксама сфармуляваны пляны далейшага ўзмацненьне барацьбы за неадкладную дапамогу беспрацоўным, за ўвядзеньне страхаваньня ад беспрацоўя. У ліку намечаных мерапрыемстваў: масавыя дэманстрацыі, назначаныя на 4 лютага. У Белы дом (рэзыдэнцыя прэзыдэнта) паступаюць шматлікія тэлеграмы ад рабочых арганізацый розных гарадоў. Арганізацыі пратэстуюць супроць адмаўленьня Гувэра прыняць беспрацоўных. (ТАСС).

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ
12-га сьнежня, у 6 гадз. вечара, у залі ЦК. АДБУДЗЕЦЦА
інструкцыйны даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. ГЕЯ
АБ РАБОЧЫЯ ЦЫ ДЛЯ ДАКЛАДЧЫКАЎ НА РАЁННЫХ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯХ
Явка ўсіх дакладчыкаў абавязкова без спасьлёнкі

Усебеларуская партнарада па пытаньнях мастацтва

ЗА ГЛЫБОКУЮ ПЕРАБУДОВУ МАСТАЦКАГА ФРОНТУ

Тав. **Гурскі** ў сваім дакладзе — «Пытаньні плянаваньня мастацтва ў БССР», падкрэсьліў, што:

— Мастацтва павінна быць вострай зброяй барацьбы з варожай пралетарыяту ідэалёгіяй, павінна быць сродкам камуністычнага выхаваньня працоўных мас. Мастацтва не забава, як многія прабуюць яго разглядаць, а зброя ў руках партыі для арганізацыі і мабілізацыі мас па выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва, арганізацыі культурнага адпачынку працоўных.

Дакладчык на шматлікіх прыкладах паказвае сучаснае становішча тэатральнай, кіно і музычнай справы ў БССР, паказвае наколькі востра стаіць праблема барацьбы за пралетарскае нацыянальнае мастацтва, падрабязна спыняючыся на посьпехах, якія дасягнуты на адным з важнейшых вучасткаў культурнай рэвалюцыі — на фронце **мастацтва**, у непрымірымым змаганьні з клясавым ворагам, з ухілямі ў бок нацыянал-дэмакратызму і вялікадзяржаўнага шавінізму.

Сучаснае становішча мастацтва БССР яшчэ далёка не задавальняе тых патрабаваньняў, якія да яго прад'яўляюцца рэканструкцыйным пэрыядам і рабочым гледачом.

— Мы, бясспрэчна, маем значны зрух у справе перабудовы мастацкага фронту, зазначае тав. Гурскі, але гэты зрух яшчэ не забясьпечвае надпарадкаваньня ўсяго мастацтва задачам сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтым напрамку ёсьць адставаньне мастацтва ад сучасных задач, асабліва ў галіне ідэалёгічна-мастацкай якасьці прадукцыі.

Спыняючыся на задачах, якія стаяць перад мастацтвам БССР, дакладчык падкрэсьлівае, што вялікае мастацтва бальшавізму можа быць створана толькі пры ўмовах забесьпячэньня арганічнай сувязі ўсяго мастацкага фронту з рабочай клясай, пралетарскай грамадзкасьцю, пры аўладаньні мэтадам дыялектычнага матэрыялізму ўсімі работнікамі мастацтва.

Дакладчык зварачае ўвагу дэлегатаў на неабходнасьць плянаваньня ўсяго мастацтва, падпарадкаваньня яго работы задачам барацьбы за ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

Займаючыся пытаньнямі плянаваньня мастацтва ў другую пяцігодку, нельга забываць аб такіх задачах, як абслугоўваньне рабочага і калгаснага гледача ня толькі ў буйных прамысловых цэнтрах, але і на пэрыферыі, у мястэчках, калгасах і саўгасах, нельга абыходзіць моўчкі пытаньняў разьвіцьця самадзейнага мастацтва, падрыхтоўкі тэатральных кадраў і г. д.

Тав. Гурскі перад удзельнікамі нарады разгортвае малюнак тэатральнага будаўніцтва на другую пяцігодку, прыводзіць арыентовачныя лічбы, паводле якіх на працягу другой пяцігодкі павінна быць пабудавана некалькі дзесяткаў тэатраў, адкрыта больш дзесятку мастацкіх школ, падрыхтавана некалькі соцень акторaў.

Грандыёзныя задачы, якія ставяцца перад мастацтвам у другой пяцігодцы, могуць быць выкананы толькі пры ўмове самай жорсткай і бальшавістнай барацьбы з усякімі скажэньнямі ленінскай нацыянальнай палітыкі, пры ўмове карэннай перабудовы ўсяго мастацкага фронту.

***

У спрэчках па дакладах т.т. **Платуна, Дзінамава і Гурскага** выказалася больш як 20 асоб.

На вячэрнім пасяджэньні 8-га сьнежня ў спрэчках выступіў тав. **Лібядзінскі Л.**

— Шэсьць умоў, якія пастаўлены т. Сталіным, — гаворыць т. Лібядзінскі, — хіба яны ня былі характэрнымі для нашага фронту мастацтва? Пытаньне аб абязьлічцы было пастаўлена сваячасова і вельмі востра, гэта было папярэджаньнем усім нам, работнікам мастацкага фронту, бо ў нас у творчасьці наглядалася самая безадказная абязьлічка.

Тав. Лібядзінскі падрабязна спыняецца на пытаньнях барацьбы з літфронтаўшчынай, паказвае на шкодлівасьць «лявацкіх» загібаў у літаратуры і мастацтве, гаворыць аб тым, што літфронтаўшчына вядзе да схематызму, да абязьлічкі ў паказе рабочага, да паказу яго, адарванага ад масы, і г. д.

Прамоўца падкрэсьлівае, што словы тав. Сталіна аб тым, што ў нас распаўсюджан гнілы лібэралізм характэрны ня толькі для галіны, аб якой ён канкрэтна пісаў — аб гістарычных навуках, — але і для мастацтва, для музыкі.

Падрабязна спыняючыся на пытаньнях барацьбы за ленінскую нацыянальную палітыку, барацьбы з ухілам у бок вялікадзяржаўнага шавінізму, тав. Лібядзінскі падкрэсьлівае, што **бальшавіком зьяўляецца толькі той, у каго за словамі аб барацьбе з вялікадзяржаўніцтвам ідзе непасрэдная і канкрэтная барацьба з носьбітамі вялікадзяржаўнага шавінізму, выкрыцьцё клясавага ворага, які нацягвае на сябе маску інтэрнацыяналізму і г. д.**

— Патрэбна паладзіць канкрэтную работу па падтрыманьні маладых парасткаў у пралетарскай музычнай культуры, — зазначае тав. Лібядзінскі, — якія ў нас ёсьць. Задача зараз заключаецца ў тым, каб гэтым маладым парасткам, аб якіх у свой час гаварыў Ленін, даць шырокую магчымасьць навучаньня. Адкрыць рабфакі, паладзіць вучобу ў гуртках, — вось шлях да вырашэньня праблемы музычных і мастацкіх кадраў.

Тав. Лібядзінскі ва ўсю шырыню стаіць задачу аб вырабе музычных інструмантаў, аб скарыстаньні спэцыялістаў па гэтай справе, якія ёсьць у БССР.

Да канца другой пяцігодкі ў кожным сельсавеце павінен быць арганізован музычны гурток. Дзесяткі тысяч працоўных павінны быць навучаны музычнаму мастацтву. Гэта патрабуе ад нас тэрміновага вырашэньня пытаньня аб музычных інструмантах.

***

У канцы ранішняга пасяджэньня 9-га сьнежня па дакладах т.т. Платуна, Дзінамава і Гурскага выступілі т.т. **Александровіч, Рафальскі, Шамшур** і інш.

На раніцнім пасяджэньні 9-га сьнежня нарада заслухала заключнае слова т.т. Платуна і Гурскага.

На вячэрнім пасяджэньні з дакладамі па пытаньні разьвіцьця тэатру выступілі т.т. **Вольскі і Канакоцін.**

Як мы эканомім апал?

ДЗЯРЖПЛЯН БССР, ЦСПСБ і «ЗЬВЯЗДА» СКЛІКАЮЦЬ 12 СЬНЕЖНЯ, У 7 ГАДЗ. ВЕЧАРА, У ЗАЛІ ПАСЯДЖЭНЬНЯЎ ДЗЯРЖПЛЯНУ (ПЛЯЦ ВОЛІ) НАРАДУ ПА ПЫТАНЬНІ АБ ЭКАНОМІІ АПАЛУ. БУДУЦЬ ЗАСЛУХАНЫ: ДАКЛАД ТАВ. ЧУДНОЎСКАГА АБ НАШЫХ АПАЛАВЫХ РЭСУРСАХ, ПРАГРАМЕ 1932 ГОДУ І ТРОХМЕСЯЧНІКУ ЭКАНОМІІ АПАЛУ, ІНФАРМАЦЫІ — ШТАБУ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ ТРОХМЕСЯЧНІКА ЭКАНОМІІ АПАЛУ (ТАВ. ЛІЎШЫЦ), БЕЛТОРФУ— АБ ВЫВАЗЦЫ ТОРФУ, МЭХАНІКА ГАРБАРНІ «БАЛЬШАВІКА» ТАВ БУРАВА АБ ВОПЫЦЬЕ ЗАВОДУ Ў СПРАВЕ ЭКАНОМІІ АПАЛУ.

НА НАРАДУ ЗАПРАШАЮЦЦА ПРАДСТАЎНІКІ ЦКК-РСІ, ГАРКК, ВСНГ, БЕЛЭНЭРГА, ІНСТЫТУТУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, БЕЛМБІТ, ГАРМБІТ, ЭНЭРГАКАМІТЭТУ, ЦП САЮЗАЎ РАБОЧЫХ МУКАМОЛЬНА-ХЛЕБНАЙ, ГАРБАРНА-ЗАБУТКОВАЙ, КЕРАМІЧНАЙ, ШВЭЙНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ, ЛЕСДРЭЎ, НАРХАРЧ, КАМУНАЛЬНАЙ ГАСПАДАРКІ, СЕЛЬПРАМ, А ТАКСАМА РАБОТНІКІ АБ'ЯДНАНЬНЯЎ І ПРАДПРЫЕМСТВАЎ, ЯКІЯ ВЕДАЮЦЬ АПАЛАМ, І КАЧАГАРЫ.

Паведамленьні

1-га студзеня 1932 г. у г. Менску (памяшканьне клюбу харчавікоў — рог Камсамольская і Інтэрнацыянальная вул.) склікаецца

УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД Т-ВА ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ БССР

з наступным парадкам дня:

1. Даклад аб міжнародным і ўнутраным становішчы і аб чартовых задачах саюзу Т-ва Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца СССР.
2. Справаздачны даклад ЦК т-ва Чырвонага Крыжу БССР і суседаклад цэнтральнай рэвізійнай камісіі т-ва.
3. Зацьвярджэньне статуту т-га Чырвонага Крыжу БССР.
4. Зацьвярджэньне кантрольных лічбаў на 1932 г. і выкананьне кашторысу за 1931 г.
5. Выборы ЦК т-ва Чырвонага Крыжу БССР і рэвізійнай камісіі.

Да адкрыцьця зьезду прыстасоўваецца тыраж II-га разраду 1-й Усесаюзнай лётарэі саюзу т-ва Чырвонага Крыжу і Чырвонага Паўмесяца СССР.

Прапануецца ўсім раённым і гарадзкім камітэтам т-ва Чырвонага Крыжу, якія яшчэ да гэтага часу не правялі канфэрэнцый, гэтакія правесьці не пазьней 25-XII 1931 г. і выбраць дэлегатаў на зьезд з паведамленьнем аб гэтым ЦК т-ва.

Адначасова закончыць збор сродкаў за лётарэю і грошы да 25-га сьнежня 1931 г. перавесьці на бягучы рахунак лётарэйнай камісіі ЦК т-ва № 86-919.

АРГ. КАМІСІЯ ЦК Т-ВА.

— **Менгарком КП(б)Б, Гарпрафсавет і аргбюро т-ва «Прыхільнік радыё»** 10 сьнежня, у 7 гадз. веч., у Доме навукі і тэхнікі скліканць канфэрэнцыю таварыства з парадкам дня: 1) Аб культурнай рэвалюцыі. 2) Выкананьне пляну радыёфікацыі і плян на 1932 г. 3) Выбары кіруючых органаў. Сакратарам партколектываў і ячэек КП(б)Б, фабзаўмясцкомам забясьпечыць яўку дэлегатаў. Білеты атрымаць з 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня па Ленінскай, 16.

— **Менгарком КП(б)Б** сумесна з **ЦП саюзу друкароў і паперніка́ў** адкрывае **курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы працаўнікоў фабрычна-заводзкага друку.** Курсы будуць арганізаваны ў г. Менску без адрыву ад вытворчасьці (вячэрнія); тэрмін навучаньня 3 месяцы. Курсы ставяць сваёй мэтай падрыхтаваць рэдактароў штодзённых газэт, кіруючых працаўнікоў фабрычна-заводзкіх і транспартных шматтыражак (друкаваных). На курсы прымаюцца: а) члены і кандыдаты КП(б)Б і ЛКСМБ, б) актыўныя рабкоры-ўдарнікі па рэкамэндацыі партыйных, камсамольскіх і прафарганізацый. Адукацыя ня ніжэй 4-х груп. Курсы пачынаюць працаваць з 1 студзеня 1932 г. Прыём заяў адбудзецца з 15-XII па 25-XII уключна. Адрас падачы заяў: культпроп гаркому КП(б)Б.

— **Да вялама ўсіх райпартгабінэтаў.** З 11 па 22 сьнежня (дэкадзік Камакадэміі БССР і СССР), у 7 гадз. веч. з Цэнтральнага Дому Камасьветы (Менск) будуць перадавацца па радыё даклады і лекцыі прадстаўнікоў Камакадэміі. Усім партгабінэтам неабходна арганізаваць слуханьне гэтых лекцый і шырока паведамляць партактыў. Расклад лекцый гл. у папярэдніх №№ газэт «Зьвязда» і «Рабочы».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ НА 1932 ГОД
НА СТАРЭЙШУЮ Ў БССР ЦЭНТРАЛЬНУЮ ШТОДЗЕННУЮ ГАЗЭТУ
ЗЬВЯЗДА
Орган ЦК КП(б)Б. XVI-ы год выданьня.
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

12 мес.	6 мес.	3 мес.	1 мес.
12 р.	6 р.	3 р.	1 р.

Падпісна прымаецца: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па друку ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

10-га сьнежня роўна ў 7 гадзін веч. у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету (пляц Волі, 4, 3-ці паверх)
АДБУДЗЕЦЦА
ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНГАРСАВЕТУ.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Плян разьвіцьця гарадзкой камунальнай гаспадаркі і культурнага будаўніцтва на 1932 г. 2) Розное.
Яўка членаў і кандыдатаў гарсавету абавязкова. Запрашаюцца прымацаваныя і дэлегаткі.

Кіно „КУЛЬТУРА“.
Ад 10-га сьнежня г. г.
НА ЭКРАНЕ новы мастацкі фільм паводле фэльетону А. ЗОРЫЧА
„ТОКАР АЛЯКСЕЕЎ“
у 6-ці частках.
Рэжысэр Е. Шастаноў, Апэратар А. Сападнёў.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ:
ТЭХНІЧНАЯ ДАПАМОГА тэхнічны фільм у 1-й частцы.
ПЯЧАТАК сэансаў у 7, 8-45, 10-30.
КАСА АДКРЫТА з 5 гадз.

Чыр. Зорка Пач.: 6, 7-30, 9, 10-30 — Гукавы спартыўны фільм ЧЫРВОНЫ СПОРТ. Гукавы фільм—ТУРКСІБ
Інтэрнацыянал Адкр. з 12 г. дня — Усходні мастацкі фільм ЗАРЭ. КІНО-НАРЫС САЮЗКІНО
„Пралетары“ Адкр. з 12 г. дня — 8, 9 і 10-XII—мастацкі фільм АПАЯКА драма у 6 частках. Звыш праграмы—хроніка Саюзкіно
„Юны Піянэр“ (бульвар кіно „Культура“) — Мастацкі фільм ПАРТФЭЛЬ ДЫПЮРУ'ЕРА. Звыш прагр.—хроніка. Пач. 1 г., 2-30. Каса—ад 11 г. дня.
„СПАРТАК“ Пач. 7-15, 9, 10-45 — Чырвоны старт у 6 части. Звыш праграмы Дзоравае золата

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР
— адбудзецца —
10-га сьнежня, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні ЦК МОПР'у
ПАРАДАК ДНЯ: 1. Справаздача заўному МОПР'у зав. „Полымя Рэвалюцыі“ аб праводзімай масава-выхаваўчай работе сярод рабочых. 2. Інфармацыі Менскага, Магілеўскага, Рагачоўскага, Барысаўскага, Жлобінскага і Быхаўскага РК МОПР'у аб ходзе месячніка мабілізацыі сродкаў. 3. Вынікі скарыстаньня Аўстрыйскай дэлегацыі па БССР. 4. Даклад аб рабоце газэты „МОПР“. 5. Аб рабоце Беларускага інтэрфэку МОПР. 6. Аб 4-м пленуме ЦК МОПР'у БССР
Яўка ўсіх членаў кандыдатаў прэзыдыуму і рэвізійнай камісіі ЦК МОПР'у—абавязкова.
Запрашаецца гарадзкі МОПР-актыў.
Просьба зьявіцца прадстаўнікам тых раёнаў, інфармацыі якіх пастаўлены на прэзыдыуме.
Сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН.

10 сьнежня г. г., у 6 гадз. веч., у памяшк. клюбу імя Карла Маркса адбудзецца
МАСАВЫ ВЕЧАР
сакратароў вчэек Асоавіяхіму, нач. складу запасу, атрадаў хімкамманд.
Запрашальныя білеты у Гарсавеце Асоавіяхіму можна атрымаць штодзенна з 11 гадз. раніцы да 6 гадз. вечара.
Менгарсавет Асоавіяхіму.

Дзяржаўнае ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ
Гэтымі днямі выходзяць з друку
1. Настольны перакідны каляндар тыраж 10.000
2. Насьценны адрыўны каляндар тыраж 250.000
Сэктар Кнігагандлю ДВБ.

Кошт публікацыі аб згубе дакум. 1 руб.

10 сьнежня, у 7 гадз. веч., у залі Бел. акадэміі навук
— скліканца —
АГУЛЬНЫ СХОД ПАРТКАЛЕКТЫВУ БАН
з парадкам дня:
ліст тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пралетарская Рэвалюцыя» і задачы Бел. акадэміі навук.

ТВМДБ
10 сьнежня, у 7 гадз. веч., у інстытуце філёсофіі БАН адбудзецца
АГУЛЬНЫ СХОД ТВМДБ
з парадкам дня: ліст т. Сталіна ў рэд. часопісі «Пралетарская рэвалюцыя» і задачы ТВМДБ.
Прысутнасьць членаў ТВМДБ і членаў ячэек салзейпічаньня ТВМДБ на прадпрыемствах абавязкова.
Праўленьне

Усе арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы, якія жадаюць атрымаць
білеты на даклады
ў часе дэкадніка Камакадэміі, павінны даць свае заяўкі ў арганізацыю БАН (рог Ленінскай і Універсытэцкай вул. № 29/35, пакой № 20, тел. 7-71) да 10-XII і атрымаць там білеты.

КЛЮБ ПРАЦАСЬВЕТЫ
(Камуністычная, 19, 13 сьнежня, у 7 гадз. веч.
— адбудзецца —
ВЯЛІКІ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР МОПР'у,
прысьвечаны 4-й гадавіне Кантонскай камуны,
Пасьля ўрачыстай часткі — мастацкая частка.
Білеты можна атрымаць у Гаркоме МОПР'у (Савецкая, 87) штодзенна ад 10-4 гадз. дня і ад 7-9 гадз. веч.
МЕНГАРКОМ МОПР'у.

Машына-будаўнічы завод ім